ВЫДУМАНЫЯ КНІГІ ПІСЬМЕННІКАЎ 20

САПРАЎДНАЯ ГІСТОРЫЯ 21

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

3 СНЕЖНЯ 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 234 (29603)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

## КАРАТКА

- **Падзяка Прэзідэнта Беларусі аб'яўлена Беларускаму саюзу жанчын.**
- Больш за 2,89 млн беларусаў прайшлі поўны курс вакцынацыі супраць COVID-19.
- **Калядны оперны форум адкрыецца прэм'ерай «Самсон і Даліла» 14 снежня.**
- Саўмін зацвердзіў канцэпцыю развіцця сістэмы адукацыі Беларусі да 2030 года.

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Святлана ЮРКЕВІЧ, Генеральны дырэктар РУП «Белпошта»:**

*«Паштовая сувязь была і застаецца самым шырокадаступным сродкам зносін у свеце, якая забяспечвае карыстальнікам доступ не толькі да традыцыйных паштовых паслуг, але і шэрагу іншых дадатковых паслуг. Асаблівую важнасць і сацыяльную значнасць беларуская пошта атрымала падчас пандэміі. Мы дастойна выконваем запатрабаваную місію, забяспечваючы стабільную работу прадпрыемства нават у самы няпросты час. Наша задача — ажыццяўляць дзейнасць у любых умовах. За ўвесь гэты час не было істотных абмежаванняў па аказанні паштовых паслуг у перыяд эпідэміі. Усе паслугі аказваліся і працягваюць аказвацца насельніцтву ў поўным аб'ёме, у тым ліку, прытрымліваючыся сучасных тэндэнцый у формах абслугоўвання насельніцтва, развіцці інфармацыйных тэхналогій, мы прапануем кліентам паслугі з дапамогай анлайн-сэрвісаў і тэрміналаў самаабслугоўвання».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «МЫ ПАВІННЫ НЕ ПРОСТА ВЫСТАЯЦЬ — МЫ ПАВІННЫ РАЗВІВАЦЦА, РУХАЦЦА НАПЕРАД»

### Прэзідэнт Беларусі сустрэўся са Старшынёй Дзярждумы Расіі і губернатарам Астраханскай вобласці

**Старшыня Дзяржаўнай Думы Расійскай Федэрацыі Вячаслаў Валодзін прыехаў у Мінск для ўдзелу ў пасяджэнні 61-й сесіі Парламенцкага сходу Саюзнай дзяржавы. Вітаючы госця, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што, хоць з Вячаславам Валодзіным яны знаёмыя даўно, афіцыйна сустракаюцца ўпершыню.**

Фота Белта.

«Мы нагонім, калі ёсць нешта ўпушчанае. Хоць, як мы сёння бачым, наўрад ці можам сябе ў чымсьці папракнуць. Адносіны Беларусі і Расіі нарэшце развіваюцца адкрыта, прынцыпова, сумленна, і мы, пільна прыглядаючыся да нашых узаемаадносін, не адчуваем нейкіх таемных плыняў. Мы вельмі рады гэтаму», — сказаў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, на дзве краіны заўсёды звонку нешта ўплывае. Але справа не ў гэтым. Галоўнае — захаваць тую цывілізацыю, якая існавала спрадвеку і існуе сёння на агульнай Айчыне, то-бок на тэрыторыі Беларусі і Расіі.

«Калі мы гэтага не зробім, гэтую цывілізацыю загубім. Няхай выюць, крычаць на Захадзе, што мы ставім перад сабой мэты яе захаваць. Але гэта так. Гэта наша прастора, наша цывілізацыя, дзе жыве шмат людзей розных нацыянальнасцяў, жыве нармальна. І сутнасць нашай цывілізацыі — што мы нікога не прыгняталі, не прыгнятаем і нікога не збіраемся прыгнятаць у адрозненне ад іх», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, да гэтай прасторы павінна адносіцца і Украіна. Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што ўкраінскі народ выраўняе сітуацыю, каб гэта было сапраўды так.

СТАР. 2

Дзеля памяці

# У спісах жывых не значыўся

**Рупліўцы школьнага музея вёскі Здзітава збіраюць і беражліва захоўваюць памяць пра байцоў 174-га стралковага палка, якія загінулі пры вызваленні вёскі Шылін**

На франтавым здымку Дзмітрый Андрыянаў (справа) з малодшым братам.

Гэтага ганаровага госця ў музеі сярэдняй школы вёскі Здзітава Бярозаўскага раёна чакаюць сёлета. Масквіч Уладзімір Дзмітрыевіч Андрыянаў абяцаў наведаць вясной альбо летам. Прыехаць у вёску, дзе шмат гадоў падтрымліваюць памяць пра яго бацьку — лейтэнанта марской пяхоты Дзмітрыя Андрыянава. Здавалася б, пры чым тут марскі пехацінец? Бярозаўшчыну вызвалялі сухапутныя часці. Пра амаль дэтэктыўную ваенную гісторыю марака, імя якога значыцца на пліце са спісам загінулых у 1944 годзе, крыху пазней, а цяпер пра музей.

СТАР. 19

Розныя — роўныя

# ЖЫЦЦЁ ПРАЦЯГВАЕЦЦА!

### Як работа на «Баркасе» дапамагае людзям прыстасавацца да дыягназу

**...Аляксандр усведамляў, што без працы яму будзе цяжка. Ён бачыў як многія яго знаёмыя ў падобнай сітуацыі проста здаюцца і жывуць на дапамогу па інваліднасці. Ён так не хацеў. Яму падавалася, што гэта будзе не жыццё, а выжыванне. На прадпрыемствах, якія згаджаліся яго ўзяць, праца ў асноўным была сядзячая. Аляксандр адчуваў там сябе так, быццам яго жыццё спыняецца. І ён не вытрымліваў і звальняўся. Неўзабаве трапіў на прадпрыемства «Баркас». Там яго ўзялі на пасаду кур'ера ў офіс у цэнтры горада. Цяпер жыццё мужчыны — рух, ён адчуў, што знайшоў сябе, і ўжо восем гадоў працуе на адным месцы.**

СТАР. 5

**Кожны дзень – са «Звяздой»!**

**Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2022 года, — у падарунак чатыры календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцавы**

ISSN 1990 — 763X

# «МЫ ПАВІННЫ НЕ ПРОСТА ВЫСТАЯЦЬ — МЫ ПАВІННЫ РАЗВІВАЦЦА, РУХАЦЦА НАПЕРАД»

## «У нас рашучая пазіцыя»

Беларускі лідар заўважыў, што заходнія апаненты паводзяць сябе непрыстойна і агідна і гэта відаць. Ён адзначыў, што, калі ў іх не атрымалася імгненна задушыць Беларусь у мінулым годзе, пачалося павольнае ўдушэнне. Паводле яго слоў, гэта адбываецца ў агульным кантэксце барацьбы супраць Расійскай Федэрацыі, супраць тых сяброў, якія сёння вакол Беларусі і Расіі. «У нас рашучая пазіцыя. Мы павінны не проста выстаяць — мы павінны развівацца як след, рухацца наперад, паказваючы ім, што мы і без іх абыдземся. У нас для гэтага ёсць усё. Я ўпэўнены, што гэта агульная пазіцыя Дзяржаўнай Думы і вас як кіраўніка», — заўважыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што знаходзіцца ў пастаянным кантакце з Прэзідэнтам Расіі. Прэзідэнты інфармуюць адзін аднаго аб сітуацыі, плануюць дзеянні на перспектыву. У планах таксама — у канцы месяца зверыць карты і вызначыць будучыню на наступны год. Беларускі лідар выказаў спадзяванне, што да іх далучацца і іншыя кіраўнікі дзяржаў постсавецкай прасторы.

«Вы не хвалюйцеся за Беларусь. Мы тут трымаемся. Як у Расіі кажуць, «трымаюцца як Брэсцкая крэпасць». Добры прыклад. Мы ўжо не будзем Брэсцкай крэпасцю, асаджаць нас ніхто не будзе, але калі людзі не разумеюць нас, то паспрабуем ім растлумачыць, што мы і робім», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## «Галоўнае — займацца змястоўнай працай»

Вячаслаў Валодзін пагадзіўся, што Беларусь і Расія — аднадумцы, якія рухаюцца ў адным напрамку. «Улічваючы, што Дзяржаўная Дума прайшла перыяд выбараў і цяпер у рамках Саюзнага парламента мы будзем абіраць кіруючыя органы, самае галоўнае — займацца змястоўнай працай, правільна зверыць пазіцыі і яшчэ раз удакладніць прыярытэты. Калі гаворка ідзе пра сяброўства, гэта вуліца з двухбаковым рухам. І трэба абавязкова пры выпрацоўцы рашэння і чуць, і ўлічваць пункты гледжання іншага боку», — сказаў ён.

## «Калі мы можам быць вам карысныя, давайце будзем дзяліцца»

Таксама ў кіраўніка дзяржавы адбылася сустрэча з губернатарам Астраханскай вобласці Расійскай Федэрацыі Ігарам Бабушкіным. Сустрэча прайшла ў межах візіту дэлегацыі Астраханскай вобласці ў Беларусь.

Кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу, што супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь з Астраханскай вобласцю заснавана на падмурку добрых беларуска-расійскіх адносін. «Апошнім часам гавораць, што мы актывізаваліся, што Захад нас да гэтага падштурхнуў. Нічога падобнага. Мы пачалі будаваць нашы адносіны яшчэ ў 90-я гады, калі падпісалі пагадненне аб саюзніцтве Беларусі і Расіі. Нават яшчэ раней, калі на рэферэндум было вынесена пытанне аб саюзе Беларусі і Расіі. І людзі ў пераважнай большасці, 80 працэнтаў, падтрымалі наш саюз Беларусі і Расіі. І вось так мы развіваліся, паколькі гэта магчыма, пераадольваючы ўсе перашкоды», — расказаў ён.

## «Любая вобласць — гэта нашы людзі»

Прэзідэнт канстатаваў, што беларускі бок дапаможа сваім партнёрам усім, чым зможа. Асабліва гэта датычыцца сельскагаспадарчай галіны. «Любая вобласць — для нас гэта нашы людзі. Мы ніколі не дзяліліся. Можам чымсьці дапамагчы ў сельскай гаспадарцы — калі ласка. Апошняе зерне аддамо, каб у вас было добра. Можаце вы нам бахчавымі культурамі дапамагчы, параіць або падказаць — будзем вельмі ўдзячныя. Тым больш што зараз гэтым займаемся. Мы разумеем, што прадукты харчавання сёння ў цане ва ўсім свеце. А харчаванне — гэта трактары, аўтамабілі, сельскагаспадарчая тэхніка. Якое будзе без гэтага харчаванне? Не можа быць. Калі мы можам быць вам карысныя, давайце дзяліцца», — сказаў ён.

Таксама беларускі лідар бачыць перспектывы ў будаўніцтве жылля, яго рэаабсталяванні. На яго думку, для гэтага можна эфектыўна выкарыстоўваць беларускія прадпрыемствы. У прыватнасці, напрыклад, «Магілёўліфтмаш».

«Ліфты не могуць служыць вечна, іх трэба замяняць. У нас захавалася прадпрыемства, вельмі моцнае. Развілі яго, нават часам не паспяваем ажыццяўляць гэтыя заказы па ліфтах. У нас ніколі не было праблем з расіянамі. Калі мы абяцалі паставіць аб'ёмы — прыедзем, усё зробім», — расказаў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, такім жа чынам можа будавацца супрацоўніцтва ў будаўніцтве дарог, прамысловасці і іншых сферах.

«Усё, што скажаце і на што здольныя, мы гатовы дапамагаць, рабіць. Спадзяюся, што з вашага боку такое ж стаўленне будзе і да нас. Вядучыя міністры тут прысутнічаюць, гаварыце адкрыта, шчыра, будзем вырашаць», — заявіў Прэзідэнт.

## Ад сельскай гаспадаркі да навукі

Па словах Ігара Бабушкіна, прыярытэт у супрацоўніцтве — тавараабмен у сферы сельгаспрадукцыі. «Нам удаецца падтрымліваць званне «ўсерасійскага агарода». У нас у вёсцы атрымала шырокае распаўсюджванне сельскагаспадарчая тэхніка, якую вы выраблянце. І, безумоўна, мы звязваем поспехі ў сельскай гаспадарцы менавіта з пастаўкамі і выкарыстаннем гэтай тэхнікі», — заявіў ён.

Ігар Бабушкін расказаў, што ў Астрахані плануецца адкрыць гандлёва-сэрвісны цэнтр Мінскага трактарнага завода. «Для нас гэта таксама вельмі важная акалічнасць, якая можа прывесці да яшчэ большага пашырэння ўзаемаадносін», — дадаў ён. Губернатар падкрэсліў, што для рэгіёна вялікае значэнне мае гуманітарнае супрацоўніцтва. Астраханскія навучальныя ўстановы актыўна працуюць разам з беларускімі.

Тавараабарот Беларусі з Астраханскай вобласцю за студзень — верасень гэтага года склаў $23,1 млн, што амаль на 29 працэнтаў больш, чым за аналагічны перыяд 2020 года. Экспарт айчынных тавараў склаўся на ўзроўні $4,7 млн. З Астраханскай вобласці за студзень — верасень гэтага года імпартавана прадукцыі на $18,4 млн.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# «ГЭТА БЫЛО НАЙВАЖНЕЙШАЕ Ў МАІМ ЖЫЦЦІ РАШЭННЕ»

**Працягваем публікацыю фрагментаў інтэрв'ю Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі генеральнаму дырэктару агенцтва «Россия сегодня» Дзмітрыю Кісялёву, цікавасць да якога ў сусветнай медыяпрасторы не зніжаецца.**

## Пра ўзмацненне граніцы з Украінай

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на няпростую сітуацыю на граніцы з Украінай. На ваенных вучэннях, да якіх прыцягнута 10 тысяч вайскоўцаў, як заяўлена, адпрацоўваюцца пытанні барацьбы з нелегальнай міграцыяй. Але, як дадае кіраўнік краіны, мяркуючы па манеўрах, мэты вучэння зусім іншыя. Таму Прэзідэнт не адмаўляе, што на гэтым напрамку магчыма нарошчванне колькасці Узброеных Сіл. «У нас цяпер 65 тысяч, напэўна, 70 будзем мець у сувязі з тым, што нам прыкрываць поўдзень трэба», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Як расказаў Прэзідэнт, у найбліжэйшы час Беларусь і Расія правядуць ваенныя вучэнні на беларуска-ўкраінскай граніцы. Яны будуць складацца з двух этапаў. Першы пачнецца ў найбліжэйшыя пару месяцаў.

## Пра выбары-2020

«Я ўжо гатовы быў, каб людзі абралі свайго новага чалавека. Можна было не ісці на гэтыя выбары, але я паступіў, прабач за нясціпласць, геніяльна. Да выбараў публічна я сказаў: ведаеце, я не магу не ісці на гэтыя выбары. Калі раптам нешта здарыцца (вайна, перавернуць краіну і іншае), і я не пайшоў на іх, і пасля выбараў гэта адбудзецца, вы ж мяне абвінаваціце, што я ўцёк, я баязлівец. Слухай, я як у ваду глядзеў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, ён у той сітуацыі вырашыў балатавацца «не таму, што вялікі, а таму, што абараняў сваю справу». «Я сваё абараняў, я ўсё гэта вылепіў сваімі рукамі. Правільна, няправільна, тут можна практыкавацца як заўгодна, але я гэта стварыў, і я абараняў як сваё, — адзначыў ён. — І вось гэта ўжо прайшло, я ў вузкім коле (потым шырокім) казаў: гэта было найважнейшае ў маім жыцці рашэнне, што я балатаваўся на гэтых выбарах».

«Добра, што я пайшоў на гэтыя выбары. Прабач мне за нясціпласць, гэта выратавала Беларусь. Не таму, што я дыктатар», — дадаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы ў інтэрв'ю таксама растлумачыў, чаму не аб'яўляе аб далейшых планах у палітыцы. «Я планую, але пра гэта не гавару па той жа прычыне, чаму не гаворыць Пуцін. Калі я скажу, што я заўтра не буду Прэзідэнтам, мы можам уявіць, што адбудзецца», — сказаў ён.

## Аб прызнанні-непрызнанні і выбарах у Польшчы

Кіраўніку дзяржавы было зададзена пытанне, ці звярталася да яго в.а. канцлера Германіі падчас нядаўніх тэлефонных размоў са словамі «пан Прэзідэнт». «Гэта значыць усе гэтыя размовы пра прызнанне-непрызнанне — усё пустое? Момант ісціны», — заўважыў інтэрв'юер.

«Я нікому не паказваў стэнаграму, гэта ж дыпламатычны... Я яе называў канцлерам, яна мяне — Прэзідэнтам. Усё гэта пустое, абсалютна, гэта дурное нават: вось, Прэзідэнтам яго прызнаюць, не прызнаюць. Слухайце, ды мне ўсё роўна, кім яны там мяне лічаць. Я ж Прэзідэнт Беларусі», — падкрэсліў беларускі лідар. «Слухайце, мяне ў Расіі, Кітаі, Індыі, Турцыі, постсавецкая прастора прызналі Прэзідэнтам і павіншавалі. Мне вось так дастаткова гэтага для таго, каб мая краіна была ўсім неабходным забяспечана», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

У інтэрв'ю Дзмітрыю Кісялёву Прэзідэнт сказаў, што прэзідэнцкія выбары ў Польшчы, якія прайшлі летась, былі сфальсіфікаваны, і Прэзідэнт Анджэй Дуда насамрэч не набраў паловы галасоў.

«Вы ж ведаеце, як перамог Дуда? Ён не набраў 50 працэнтаў галасоў, яму накруцілі», — сказаў беларускі лідар. Адказваючы на пытанне, ці сфальсіфікаваны былі там выбары, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Абсалютна».

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што ў Польшчы зараз магутная апазіцыя. «Цяпер Дональд Туск туды патрапіў, у «Грамадзянскую платформу». Гэта ПіС — «Права і Справядлівасць»... Ва ўладзе гэты Качыньскі, які выжыў з розуму, і Маравецкі, Дуда — тройца гэтая. Калі апазіцыя падняласа пасля выбараў, некалькі тысяч галасоў — менш за працэнт — афіцыйна яму далі, каб яго прызнаць пераможцам», — сказаў ён.

Паводле слоў Прэзідэнта Беларусі, калі апазіцыя выйшла на вуліцы, «амерыканцы тупнулі: стоп, няхай пабудуць, наступныя вы». «Польшча знаходзіцца пад знешнім кіраваннем яшчэ больш моцным, чым Украіна, толькі яны не «пыляць», яны робяць гэта ціха, спакойна. Таму там большая частка грамадства не хоча бойкі з Беларуссю. Яны ад нас нічога дрэннага не бачылі. Яны абразуміліся сёння, ачунялі, і яны бачаць, што адбываецца і хто ў гэтым вінаваты», — адзначыў беларускі лідар.

«З прыходам Туска, а гэта моцны палітык, яны там грымнуцца, — упэўнены кіраўнік дзяржавы. — Там ёсць з кім размаўляць, там будзе з кім размаўляць, палякі няпросты народ — яны прымусяць любога палітыка рабіць тое, што ім выгадна».

## Пра апазіцыю

У інтэрв'ю Прэзідэнт расказаў, што апазіцыя рыхтуе новыя пратэсты ў Беларусі. «Нядаўна я атрымаў праграму, жудасная, дзікая, з майго пункту гледжання, яўна разлічаная на фінансаванне. Яны разумеюць, што, калі нехта выйдзе, яны выйдуць для таго, каб іх прафінансавалі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, раней Захад разлічваў на дапамогу беларускай апазіцыі ў звяржэнні ўлады і фінансаваў яе. «Гэта спачатку так было, калі яны збеглі туды. Яны думалі: зараз створым урад, Лукашэнку прыбяром, іх пасадзім. Гэта ўжо было ў момант пасля выбараў. Яны спадзяваліся. Цяпер не спадзяюцца. Цяпер ім трэба захаваць твар. Таму яны іх трымаюць», — сказаў ён Дзмітрыю Кісялёву.

Прэзідэнт адзначыў, што цяпер за мяжой ёсць тры цэнтры апазіцыі. «А паміж імі яшчэ структуркі. Жыць хочацца, есці хочацца. А проста так на Захадзе ніхто не дасць: грошы заканчваюцца. І ў іх пачалася бойка», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

## Пра абнаўленне Канстытуцыі

Размаўляючы з журналістам, Аляксандр Лукашэнка расказаў, што праект абноўленай Канстытуцыі Беларусі будзе апублікаваны да Новага года, а рэферэндум па ёй плануецца правесці ў 20-х лікавых лютага, калі не адбудзецца нейкай надзвычайнай сітуацыі.

«Цяпер мы яе апублікуем, каля месяца. Я думаю, што тыдні два. А ў лютым у 20-х прыкладна лікавых (яшчэ падумаем, як нам зручней і па законе, па цяпер дзеючай Канстытуцыі ёсць тэрміны ўнясення на рэферэндум) Канстытуцыя будзе ўнесена мною на рэферэндум», — сказаў кіраўнік краіны.

Адказваючы на ўдакладняльнае пытанне, ці адбудзецца рэферэндум у лютым, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Калі не пачнецца вайна, не дай бог».

Прэзідэнт растлумачыў, што пасля прыняцця змяненняў у Канстытуцыю ў Беларусі адбудуцца новыя выбары ўсіх органаў улады. «І парламента, і прэзідэнцкія, і дэлегатаў Усебеларускага сходу, — адзначыў кіраўнік краіны. — Нам да прэзідэнцкіх выбараў прыкладна тры-чатыры гады. Яны могуць максімум адбыцца ў тэрмін. Але, магчыма, будуць і датэрміновыя выбары».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка не змог адказаць на пытанне, ці стане ён удзельнічаць у наступных выбарах. Паводле яго слоў, гэта будзе залежаць найперш ад сітуацыі ў краіне.

Адказваючы на пытанне, як бы ён хацеў увайсці ў гісторыю, Прэзідэнт заявіў, што не думаў аб гэтым. «Шчыра, я табе клянуся! Я аб гэтым не думаю, таму што не збіраюся адыходзіць ад той вялікай палітыкі, якая сёння ў нас з табой перад вачыма. На жаль, цяжкія часы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, ён хоча быць «стваральнікам гэтай дзяржавы».

# «Саюзнае будаўніцтва — рэальны інструмент абароны інтарэсаў народаў»

## Сесія Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі прайшла ў Мінску

**Пачаліся мерапрыемствы з перагавораў Старшыні Дзяржаўнай Думы Расіі Вячаслава ВАЛОДЗІНА і Старшыні Палаты прадстаўнікоў Уладзіміра АНДРЭЙЧАНКІ. Падчас іх Старшыня Палаты прадстаўнікоў адзначыў адкрыты, узаемавыгадны, добразычлівы характар адносін Беларусі і Расіі.**

Фота БелТА.

Выступаючы на пачатку пасяджэння дэпутатаў у Авальнай зале, Уладзімір Андрэйчанка заявіў, што саюзнае будаўніцтва — не абстрактны геапалітычны праект, а рэальны інструмент абароны інтарэсаў народаў Саюзнай дзяржавы. «Глыбока перакананы, што поспех Саюзнага будаўніцтва магчымы толькі на шляху актыўнага ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва ўсіх галін улады», — акцэнтаваў спікер Палаты прадстаўнікоў.

Каб зрабіць работу Парламенцкага сходу максімальна эфектыўнай, ён прапанаваў разгледзець магчымасць уключэння саюзных дэпутатаў у склад міжведамасных рабочых груп па гарманізацыі заканадаўства. Гэта дасць магчымасць, па словах Уладзіміра Андрэйчанкі, падключыць дэпутацкі корпус да распрацоўкі рашэнняў на стадыі іх падрыхтоўкі і ўбачыць перспектывы той ці іншай сферы заканадаўства.

Выказаўся ён і на тэму міжнароднага парадку дня, адзначыўшы, што далёка не ўсіх цешаць поспехі саюзнага будаўніцтва.

«Фарміраванне шматпалярнага свету выклікае з боку калектыўнага Захаду і ў першую чаргу ЗША цвёрдае непрыманне гэтага працэсу. Менавіта тут хаваецца асноўная прычына той непрадуманай і катастрафічнай па сваіх наступствах палітыкі, калі міжнароднае права падмяняецца сілай, эканамічнае супрацоўніцтва — санкцыямі, разрадка — гонкай узбраенняў. Пры гэтым ухіленне наступстваў такой палітыкі ўскладаецца на трэція краіны. Так званы міграцыйны крызіс на заходняй граніцы Беларусі — яскравае таму пацвярджэнне», — заявіў спікер Палаты прадстаўнікоў.

Уладзімір Андрэйчанка падкрэсліў, што польскае і літоўскае кіраўніцтва, грэбуючы ўсімі міжнароднымі нормамі, элементарнымі нормамі чалавечай маралі, ставіць пад пагрозу жыццё і здароўе людзей. «Здавалася б, такія дзеянні павінны атрымаць неадкладную рэакцыю з боку краін ЕС і ЗША, якія лічаць сябе эталонам дэмакратыі. Але не, Захад маўчыць. Больш за тое, замест садзейнічання ў вырашэнні сітуацыі, якая склалася, Беларусь атрымлівае чарговы пакет санкцый», — сказаў Уладзімір Андрэйчанка.

Учора ў рамках сесіі дэпутаты разгледзелі і пытанне аб Заяве Парламенцкага сходу ў сувязі з міграцыйным крызісам на граніцы Беларусі і Еўрасаюза, якую прынялі аднагалосна.

Паводле Уладзіміра Андрэйчанкі, прыняцце гэтай заявы стане нашай чарговай спробай адкрыта звярнуцца да заходніх міжпарламенцкіх арганізацый.

«У цэлым нам трэба больш актыўна і аператыўна выкарыстоўваць фармат заяў Парламенцкага сходу па актуальных пытаннях міжнароднага парадку дня. Нашы апаненты павінны дакладна разумець, што наша пазіцыя адзіная і мы будзем цвёрда адстойваць свае інтарэсы», — рэзюмаваў Старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Старшынёй Парламенцкага сходу па традыцыі абралі Старшыню Дзяржаўнай Думы Расіі Вячаслава Валодзіна. Яго першым намеснікам зацверджаны Уладзімір Андрэйчанка. Таксама падчас сесіі абралі абноўленыя склады камісій і іх старшынь.

### Саюзныя праграмы і заява па міграцыйным крызісе

Асноўнымі тэмамі парламенцкіх абмеркаванняў сталі выпрацоўка мер для выканання палажэнняў Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы на 2021—2023 гады і сітуацыя на беларуска-польскай і беларуска-літоўскай граніцах.

Па першым пытанні выступіў **дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ.** У сваім дакладзе ён расказаў, што ўрады прыступілі да работы па фарміраванні падыходаў рэалізацыі саюзных праграм. «Яны (саюзныя праграмы. — **«Зв.»**) вызначаюць іншы маштаб і глыбіню ўзаемадзеяння ў самых значных сферах нацыянальных эканомік, каб адзіная эканамічная прастора Саюзнай дзяржавы мела іншыя, больш значныя характарыстыкі», — дадаў дзяржсакратар.

Паводле яго слоў, новы этап будаўніцтва Саюзнай дзяржавы ставіць новыя задачы перад нацыянальнымі парламентамі і Парламенцкім сходам Беларусі і Расіі. Так, для рэалізацыі 28 праграм давядзецца прыняць каля 400 актаў рознастайнага ўзроўню.

«Па сутнасці, будзе гарманізавана рэгуляванне ключавых сфер узаемадзеяння на агульным інтэграцыйным падмурку. У многім менавіта вашы рашэнні, рашэнні парламентарыяў могуць пацвердзіць блізкасць падыходаў да фарміравання мадэльнага заканадаўства», — мяркуе Дзмітрый Мезенцаў.

Неабходнасць прыняцця Заявы Парламенцкага сходу ў сувязі з міграцыйным крызісам на граніцы Беларусі і Еўрасаюза прадставіў **член Савета Рэспублікі Сяргей РАЧКОЎ.** Паводле яго слоў, польскія і літоўскія ўлады перакладваюць адказнасць за сітуацыю на Беларусь і Расію, утойваючы ад еўрапейскай грамадскасці падзеі на граніцы. «Відавочна, што канфрантацыяй праблему не вырашыць. Неабходны канструктыўны дыялог і ўзаемадзеянне Еўрапейскага саюза і Рэспублікі Беларусь. У сувязі з гэтым у Заяве Парламенцкага сходу мы заклікаем структуры Еўрапейскага саюза не толькі даць аб'ектыўную ацэнку дзеянняў польскіх і літоўскіх улад, але і прыняць канкрэтныя меры па вырашэнні крызісу», — расказаў Сяргей Рачкоў.

***

У размове з журналістамі па выніках сустрэчы Вячаслаў Валодзін і Уладзімір Андрэйчанка адзначылі, што прынятыя рашэнні павысяць эфектыўнасць Парламенцкага сходу і будуць садзейнічаць таму, каб саюзная справа мела канчатковы вынік, а рашэнні прэзідэнтаў краін хутчэй рэалізоўваліся ў жыццё.

Другая частка сесіі Парламенцкага сходу Беларусі і Расіі адбудзецца ў вочным фармаце ў снежні ў Маскве. На ёй разгледзяць праект бюджэту Саюзнай дзяржавы.

***

Адказваючы на пытанні журналістаў, старшыні ніжніх палат парламентаў акцэнтавалі ўвагу на міграцыйнай праблеме. Вячаслаў Валодзін азначыў, што двайныя стандарты еўрапейскіх дзяржаў недапушчальныя ў адносінах краін да праблемы бежанцаў. «Калі размова ідзе пра тое, што краіны Еўропы (у першую чаргу гэта дзесяць былых Польшчы і прыбалтыйскіх краін) кажуць адно, а робяць другое, тады еўрапейскія інстытуты, той жа Еўрапарламент, ПАСЕ, Парламенцкая асамблея АБСЕ павінны даваць ацэнку ім, уводзіць супраць іх санкцыі, асуджаць. Недапушчальна так адносіцца да бежанцаў», — сказаў Вячаслаў Валодзін.

Уладзімір Андрэйчанка падкрэсліў, што міжнародныя структуры не робяць ніякіх гучных заяў адносна праблемы бежанцаў, а крызіс выкарыстоўваецца для павелічэння ваеннай прысутнасці войскаў на межах Саюзнай дзяржавы.

«Наша пазіцыя — сёння трэба садзіцца, адкладаючы ў бок усе палітычныя рознагалоссі, і знаходзіць рашэнне праблем», — заявіў спікер Палаты прадстаўнікоў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Акцэнты

# ДЫЯЛОГ — АСНОВА ДАВЕРУ, А ДАВЕР — АСНОВА РАЗВІЦЦЯ

## Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА сустрэлася са Старшынёй Дзяржаўнай Думы Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі Вячаславам ВАЛОДЗІНЫМ

**Вітаючы госця, спікер верхняй палаты беларускага парламента акцэнтавала ўвагу, што сёння адносіны дзвюх краін развіваюцца абсалютна па ўсіх кірунках, важным складнікам сярод якіх з'яўляецца парламенцкае ўзаемадзеянне на ўсіх узроўнях: «Мы працуем разам на міжнародных пляцоўках, падтрымліваем адно аднаго».**



Яна звярнула ўвагу, што сітуацыя, якая разгортваецца вакол Беларусі і Расіі, няпростая: «Як сказаў на сустрэчы з вамі Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, у гэтай сітуацыі нам трэба «не проста выстаяць, а неабходна развівацца і рабіць гэта эфектыўна».

Спікер дадала: тым больш важныя падпісаныя кіраўнікамі краін на пасяджэнні Вышэйшага дзяржаўнага савета інтэграцыйныя дакументы. «Несумненна, гэта будзе садзейнічаць новаму этапу ў развіцці нашых адносін, — выказала ўпэўненасць Старшыня Савета Рэспублікі. — Для нас, парламентарыяў, гэта сур'ёзная праца ў развіцці заканадаўчай базы, гарманізацыі заканадаўства і рэалізацыі дамоўленасцяў, якія былі падпісаны».

Яна адзначыла, што парламентарыі актыўна ўключацца ў гэту работу, каб дасягнутыя дамоўленасці былі на карысць народаў Беларусі і Расіі, на карысць абедзвюх краін.

Са свайго боку, Вячаслаў Валодзін паведаміў аб плённай працы ў рамках Парламенцкага сходу. Ён акцэнтаваў увагу, што парламентарыяў чакае карпатлівая работа: «Нам яшчэ далёка да інстытутаў, якія павінны быць у рамках Саюзнай дзяржавы. Гэта пачатак шляху інтэграцыі, няхай па ключавых кірунках, улічваючы прынятыя рашэнні. Усё ж такі гэта дыялог». Ён падкрэсліў: калі гаворка ідзе аб сустрэчах паміж дэпутатамі, важна, каб было разуменне на ўзроўні заканадаўства і тады будзе лягчэй прымаць рашэнні ў рамках Саюзнага парламента і ў рамках міждзяржаўных пагадненняў.

«Таму дыялог — аснова даверу, а давер — аснова развіцця», — перакананы спікер Дзяржаўнай Думы Расіі.

Ён выказаў спадзяванне, што першая сустрэча ў Савеце Рэспублікі стане добрым імпульсам і асновай для развіцця больш эфектыўных адносін.

**Вольга АНУФРЫЕВА, фота БелТА.**

Блізкая ўлада

# ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, **4 снежня**, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАУС. Тэл. 8 021 222 22 22;

• намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Анатольевіч БАРАНОЎСКІ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь Іосіфавіч НЯВЕРА. Тэл. 8 015 273 56 44;

• намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Анатольевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;

• першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Сяргей Віктаравіч ЛЯЎКОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Аляксандр Вікенцьевіч ДАРАХОВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Сітуацыя

# НА ВЫЕЗДЗЕ З БЕЛАРУСІ — КАЛЯ 4,5 ТЫСЯЧЫ ВЕЛІКАГРУЗАЎ

**Асноўнай прычынай навалы фур на граніцы з'яўляецца невыкананне Польшчай і Літвой дамоўленасцяў па афармленні грузавога транспарту, заявілі ў Дзяржпагранкамітэце.**

Усяго тры з дзевяці еўрапейскіх пунктаў пропуску на граніцы з Беларуссю выканалі дамоўленасці па афармленні грузавога транспарту. Літоўскі бок зноў не выканаў норму па пропуску грузавікоў. У пункце «Мядзінінкай» (з беларускага боку — «Каменны Лог») сумежны бок аформіў усяго 59 працэнтаў машын. Польскі бок выконвае адпаведныя дамоўленасці ўсяго на 65 працэнтаў. «Гэта прыводзіць да вялікай колькасці машын на іншых напрамках. Так, нягледзячы на тое, што за мінулыя суткі латвійскія пункты пропуску выканалі дамоўленасці ў поўным аб'ёме, на гэтым напрамку працягвае павялічвацца паток велікагрузаў», — адзначылі ў Дзяржпагранкамітэце.

Калі сумежныя бакі не прымуць неабходныя меры, сітуацыя з чэргамі фур на граніцы пагоршыцца. Пра гэта заявілі БелТА ў Дзяржаўным мытным камітэце.

Выезду з Беларусі чакаюць каля 4,5 тысячы грузавых транспартных сродкаў. На літоўскім напрамку — больш за 2,5 тысячы машын, на польскім — каля тысячы. На граніцы з Латвіяй выезду чакаюць 950 грузавікоў. Як растлумачылі ў ДМК, гэта звязана з тым, што пасля закрыцця польскім бокам пункта пропуску «Кузніца Беластоцкая» (з беларускага боку — «Брузгі») паток грузавых аўтамабіляў перарасперкаваўся ў першую чаргу ў напрамку «Бераставіцы» і «Казловічай». Пры гэтым з пачатку лістапада ўстаноўленыя нормы па прыёме транспартных сродкаў у пункце пропуску «Бераставіца» выконваюцца польскім бокам толькі на 60 %, у пункце пропуску «Казловічы» — на 75 %. З літоўскага боку дамоўленасці па прыёме транспартных сродкаў таксама не выконваюцца: у пункце пропуску «Каменны Лог» літоўскім бокам прымаецца парадку 65 % транспартных сродкаў, у «Катлоўцы» і «Прывалцы» — 80 %.

«У сувязі з надыходзячымі калядным і навагоднімі святамі грузапаток будзе павялічвацца. Затрымка грузавікоў на мытнай мяжы ўжо прыносіць фінансавыя і часовыя затраты перавозчыкам, у большай ступені замежным», — заявілі ў ДМК.

Мытныя органы Беларусі прымаюць усе неабходныя меры па забеспячэнні максімальнага афармлення транспартных патокаў, якія ідуць праз мытную граніцу, падкрэслілі ў ведамстве. «Беларусь у поўнай меры выконвае замацаваныя двухбаковымі пагадненнямі нормы і прымае ўсе транспартныя сродкі, падачу якіх забяспечваюць сумежныя дзяржавы, а таксама гатовая павялічыць колькасць прыманых аўтамабіляў. Пры гэтым пасля праходжання ўсіх кантрольных службаў на беларускім баку перавозчыкам прыходзіцца чакаць уезду ў Літву і Польшчу больш за 4 гадзіны, а ў Латвію — 3 гадзіны», — адзначылі ў Дзяржаўным мытным камітэце.

**Пётр ДУНЬКО.**

Надвор'е

# На выхадных — мароз і снег

**Надвор'е Беларусі сёння фарміруе атлантычны цыклон «Данізль», цэнтр якога размяшчаецца над краінамі Балтыі.**

У пятніцу ўмовы надвор'я ў Беларусі будзе вызначаць у асноўным вобласць паніжанага атмасфернага ціску, раніцай і днём па паўднёвым усходзе краіны скажацца ўплыў атмасфернага фронту. Будзе воблачна з праясненнямі. У дзённы час у асобных раёнах па паўднёвым усходзе краіны чакаецца моцны мокры снег. Месцамі па краіне магчымы галалёд, слабы туман, на асобных участках дарог — галалёдзіца. Вецер пераважна паўднёва-заходні парывісты, па паўночным захадзе моцны парывісты. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад мінус 2 да плюс 3 градусаў.

У суботу таксама воблачна з праясненнямі. Месцамі па Беларусі кароткачасовы снег і галалёдзіца на асобных участках дарог. Вецер пераважна паўднёва-заходні, паўднёвы ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—7 градусаў марозу, па поўначы пры праясненнях — мінус 8—10. Днём будзе ад мінус 3 да плюс 2 градусаў.

У нядзелю ўмовы надвор'я будзе ў асноўным вызначаць франтальны раздзел, які перамяшчаецца з захаду Еўропы. Ноччу захаваецца ўплыў вобласці паніжанага атмасфернага ціску. Пераважна воблачна. Уначы па паўночным захадзе, днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе кароткачасовы снег. На дарогах — галалёдзіца. Вецер пераважна паўднёвы, паўднёва-ўсходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—7 градусаў марозу, на ўсходзе пры праясненнях — мінус 8—10. Днём будзе ад мінус 4 да плюс 1 градуса.

У панядзелак будзе адчувацца ўплыў маларухомага атмасфернага фронту. У многіх раёнах краіны пройдзе снег і мокры снег, на паўднёвым усходзе — з дажджом. Месцамі магчымы слабыя туман і галалёд. Вецер пераважна паўднёва-ўсходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 6 да плюс 1, днём — ад мінус 4 да плюс 2.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Лаўроў раскрытыкаваў ператварэнне суседніх з Расіяй краін у ваенны плацдарм НАТА

**Кіраўнік МЗС Расіі Сяргей Лаўроў заявіў, што Масква супраць ператварэння суседніх з Расіяй краін у ваенны плацдарм. Аб гэтым ён паведаміў падчас выступлення на Савеце міністраў замежных спраў АБСЕ, перадае ТАСС.**

«Ператварэнне нашых краін-суседзяў у плацдарм супрацьстаяння з Расіяй, разгортванне сіл НАТА ў непасрэднай блізкасці ад стратэгічна важных для нашай бяспекі раёнаў катэгарычна непрымальнае», — сказаў ён.

Раней генеральны сакратар НАТА Енс Столтэнберг заявіў, што ў альянсу няма планаў па размяшчэнні ядзернай зброі ў іншых краінах. Пра тое ён паведаміў на канферэнцыі Reuters Next. Да гэтага Столтэнберг на прэс-канферэнцыі па выніках двухдзённай сустрэчы міністраў у Рызе расказаў, што кіраўнікі МЗС НАТА заявілі аб неабходнасці пазбегнуць эскалацыі на граніцах Расіі і Украіны. Разам з тым генеральны сакратар НАТА заявіў, што кіраўнікі МЗС краін Паўночна-атлантычнага альянсу выступілі за дыялог з Расіяй.

### На граніцы Афганістана і Ірана пачаліся баі

**Паміж «Талібанам», які захапіў уладу ў Афганістане (арганізацыя забаронена ў шэрагу краін), і пагранічнікамі Ірана пачаліся баі на граніцы, паведамляе агенцтва Aamaj News у Twitter.**

Вядома, што інтэнсіўныя ўзброеныя сутыкненні ідуць у правінцыі Німроз на поўначы Афганістана. Паведамляецца, што некалькі іранскіх КПП ужо перайшло пад кантроль талібаў, а некалькі пагранічнікаў трапіла ў палон. Афганскія тэрарысты таксама сцягваюць бранятэхніку да граніцы. Мясцовыя жыхары пакінулі свае дамы.

Прычыны канфлікту пакуль не раскрываюцца.

Раней паведамлялася, што на ўсходзе Афганістана, у правінцыі Лангман, узброеныя сапернікі «Талібана» пачалі партызанскую вайну. Барацьбіты з талібамі адзначылі, што падтрымліваюць Фронт нацыянальнага супраціўлення, які ўзначальвае Ахмад Масуд.

Між тым большая частка насельніцтва Афганістана сутыкнецца з голадам зімой. Такое развіццё сітуацыі ў краіне прадказаў афганскі пасол у Расіі Саід Таеб Джавад у інтэрв'ю агенцтву ТАСС. Па словах дыпламата, пасля захопу ўлады баевікамі руху «Талібан» для жыхароў краіны наступілі цяжкія дні. «Мы сутыкаемся з вострым недахопам харчавання і крахам эканомікі, адчаем, безнадзейнасцю», — расказаў ён.

### Saxo Bank апублікаваў «вар'яцкі» прагноз на 2022 год

**Галоўны эканаміст Saxo Bank Стын Якабсен даў традыцыйныя «вар'яцкія» прадказанні на 2022 год.**

Па прагнозе скандынаўскага банкіра, налета мір чакае шмат сур'ёзных змен у галіне эканомікі. Урады краін па ўсім свеце вымушаныя будуць адкласці «зялёны» энергетычны пераход і ссунуць тэрміны рэзкага зніжэння выкарыстання нафты (на 29 працэнтаў) і газу (на 10 працэнтаў) на пяць і 10 гадоў.

Найбуйнейшую сацсетку свету Facebook чакае спад з-за адтоку маладых карыстальнікаў, незадаволеных узроўнем абароны персанальных даных і якасцю кантэнту. Злучаныя Штаты, на думку Якабсена, сутыкнуцца з рэцэсіяй з прычыны палітычнага крызісу з-за прамежкавых выбараў у Кангрэс, а ўзровень інфляцыі і беспрацоўя ў краіне дасягне 15 працэнтаў.

У біямедыцыне, паводле прагнозу эканаміста дацкага банка, будзе здзейснены сапраўдны прарыў, які дазволіць рэдагаваць ДНК чалавека. Новыя тэхналогіі дадуць магчымасць прадаўжаць жыццё людзям у сярэднім на 25 гадоў, аднак для дзяржаў гэта створыць дадатковыя праблемы, выкліканыя перанасяленнем.

Стын Якабсен штогод прэзентуе «вар'яцкія прагнозы» налета. Эканаміст папярэджвае, што не імкнецца да дакладнасці прадказанняў і толькі спрабуе ўявіць, як можа выглядаць свет у будучыні.

На слыху

# ДЛЯ ТЫХ, ХТО ХОЧА ВЕДАЦЬ ПРАЎДУ

## Сведчанні злачынстваў, якія адбываюцца супраць бежанцаў на беларуска-польскай граніцы, сабраныя пад вокладкай кнігі

**У выданні прадстаўлены факты і дакументальныя паказанні беларускіх і замежных журналістаў аб злачынствах супраць бежанцаў, здзейсненых уладамі Польшчы і Літвы, а таксама прадстаўнікамі шматлікіх службаў гэтых дзяржаў на сумежных з Беларуссю ўчастках дзяржаўнай граніцы летам і восенню гэтага года. Кніга, якая ўбачыла свет у выдавецтве «Беларусь», — адзін з вынікаў шырокага грамадскага расследавання злачынстваў супраць бежанцаў.**

— Выданне прысвечана тым падзеям, якія цяпер без перабольшання на слыху ва ўсяго свету, — адзначыў падчас прэс-прэзентацыі кнігі, якая адбылася ў Доме прэсы, **старшыня праўлення Рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства «Веды» Вадзім ГІГІН.** — Апублікаваныя даныя адлюстроўваюць злачынныя дзеянні польскіх і літоўскіх сілавікоў, а таксама палітыкаў, якія аддаюць гэтыя злачынныя загады. Да кнігі вялікую цікавасць праяўляюць за мяжой, у першую чаргу ў Расійскай Федэрацыі. Некалькі выдавецтваў на тэрыторыі Еўрапейскага саюза выступілі з ініцыятывай яе выдання на англійскай, а магчыма, і на італьянскай мовах.

У работу па зборы фактаў актыўна ўключыўся Выдавецкі дом «Беларусь сегодня». У планах аўтараў праекта — зафіксаваць і сведчанні бежанцаў. «Яны расказваюць аб тым, што адбылося, але калі трэба зафіксаваць іх персанальныя даныя, бежанцы маўчаць: баяцца помсты ў тым ліку з боку тых рэжымаў, бо разумеюць, што гэта адзіная прастора Еўрапейскага саюза», — акцэнтаваў увагу Вадзім Гігін.

Як заўважыў **старшыня камісіі па этыцы Беларускага саюза журналістаў дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ**, кніга застанецца ў гісторыі і будзе запатрабаваная грамадствам, усімі людзьмі, якія хочуць ведаць праўду. «Трэба зафіксаваць усе злачынствы, каб пасля можна было аргументавана паказваць многім народам, спажыўцам медыя сваю пазіцыю, а таксама дэманстраваць агульнаеўрапейскія факты, да чаго прыводзяць тыя ці іншыя тэндэнцыі ў зносінах паміж дзяржавамі, палітычнымі сістэмамі, — падкрэсліў Аляксандр Карлюкевіч. — Калі мы не азірнёмся назад і не паглядзім на вопыт палітычнай гісторыі другой паловы стагоддзя, не зразумеем, як выходзілі з крызісу пасля той страшнай бойні, учыненай нацысцкай Германіяй».

— Мы цяпер назіраем вельмі небяспечны працэс краху той сістэмы, якая ўзнікла пасля 1945 года, — заявіў **старшы навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксей ДЗЕРМАНТ.** — Нагадаю, што менавіта па выніках Другой сусветнай вайны была прынята Дэкларацыя правоў чалавека, а таксама створана Арганізацыя Аб'яднаных Нацый. Гэтыя інстытуты, дзе з аднаго боку — абарона і выкананне правоў чалавека, а з другога — міжнародная арганізацыя, у юрысдыкцыю якой уваходзіць у тым ліку абарона ўразлівых асоб, бежанцаў. Па сутнасці, уся еўрапейская гуманістычная традыцыя, якая пасля 1945 года была на вяршыні свайго развіцця, сёння перажывае не проста крызіс, а крушэнне.

На думку палітолага, працэс бесчалавечных адносін да бежанцаў звязаны і з працэсам рэабілітацыі нацызму, які і быў асноўнай страшнай сілай падчас Другой сусветнай вайны, якая пагарджала элементарнымі правамі чалавека і выбудавала расавую іерархію ў адносінах да іншых людзей, акрамя немцаў. «Тое ж самае, па сутнасці, адбываецца і цяпер, — заўважыў палітолаг. — Дэгуманізацыя, якую мы назіраем у Еўрапейскім саюзе, — гэта трывожны і жудасны сігнал».

Неўзабаве кніга з'явіцца ва ўсіх кнігарнях. Па яе матэрыялах створаны інтэрнэт-праект — https://whitebook.by/, які будзе ўвесь час абнаўляцца і стане пашыраным працягам кнігі.

**Вераніка КАНЮТА, фота аўтара.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Ярмошыну Уладзіміру Васільевічу, члену Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага склікання, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю ДАЧКІ.**

# ЖЫЦЦЁ ПРАЦЯГВАЕЦЦА!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Усвядоміць сябе значным, патрэбным і карысным важна для кожнага з нас, — гаворыць **дырэктар унітарнага прадпрыемства «Баркас» грамадскага аб'яднання «БелТІ» (Беларускае таварыства інвалідаў) Барыс ШЧАРБІНІН** *(на фота)*. — Гэтыя пачуцці дадаюць чалавеку моцы жыць, нават калі з ім здарылася бяда і ён стаў інвалідам. Наогул, любое захворванне, якое прыводзіць да інваліднасці, выбівае чалавека з каляіны. Ён бачыць прадпісанне МРЭК, у якім паказваецца, што яму нельга падымаць больш за 5 кг, нельга шмат хадзіць, і губляецца. І калі чалавек не меў поўнай жыццёвай загартоўкі, то пасля траўмы ён спыняе сваю працоўную дзейнасць, страчвае прафесійныя навыкі і самае сумнае — веру ў сябе і адказнасць. Ён быццам бы становіцца зламаным псіхічна.

Некаторыя ў гэтым стане ўсё ж імкнуцца неяк знайсці працу, але, атрымліваючы адмову за адмовай, адчуваюць сябе «бескарысным» як для сям'і, так і для грамадства ў цэлым. Іншыя знаходзяць выйсце ў алакаголі і пачынаюць піць і тым самым яшчэ больш ускладняюць ужо не толькі сваё жыццё, але і жыццё родных.

Часта здаралася, што чалавек з абмежаванымі магчымасцямі, які прыходзіў на сумоўе да дырэктара прадпрыемства, ужо з парога панура заяўляў, што «хутчэй за ўсё, не падыходзіць для працы». Але кіраўнік ведаў, як цяжка пераадолець сваю няўпэўненасць такім людзям, і ўсё роўна разглядаў магчымасці прэтэндэнта, імкнуўся зразумець яго інтарэсы і такім чынам падбіраў пасаду. Потым вельмі беражліва новенькага ўводзілі ў калектыў і праз працу рэабілітавалі яго псіхалагічны стан.

— У нас ёсць слесар, які шмат гадоў не працаваў па сваёй прафесіі пасля атрымання інваліднасці, — расказвае Барыс Іванавіч. — І калі ён прыйшоў да нас, дык нават не памятаў, як трымаць у руках малаток. Але паціху, пераадольваючы сябе, вярнуў свае навыкі, стаў больш упэўненым, якасць яго працы значна павысілася.

Ужо на працягу многіх гадоў прадпрыемства «Баркас» працуе ў складзе «Беларуская таварыства інвалідаў». Некаторыя нават называюць яго непатапляльным баркасам. Кіраўнік лічыць, што гэта так, бо яны робяць важную справу для ўсяго грамадства.

У аснове дзейнасці прадпрыемства была закладзена швейная вытворчасць. Пачыналі працаваць з чатырох швейных машын. Па меры развіцця выраслі да колькасці працаўнікоў у 90 чалавек, з якіх больш за 50 % маюць інваліднасць. Сёння прадпрыемства выпускае больш за 150 відаў базавых мадэляў форменнага, рабочага і спецыяльнага адзення, а таксама вырабляе камплекты сталовай, пасцельнай бялізны і іншае.

У асноўным шыюць для прадпрыемстваў бюджэтнай сферы — бальніц, дзіцячых устаноў, інтэрнатаў. Акрамя таго, у «Баркаса» ёсць восем аўтамабіляў, якія не толькі развозяць гатовыя заказы, але і зарабляюць у вольны час, выконваючы заказы на развоз прадукцыі іншых прадпрыемстваў.

У склад «Баркаса» сёння ўваходзіць і дапаможны зборачна-мантажны цэх, у якім работнікі робяць сталы, шафкі для дакументаў, шафы-купэ.

Жаданне дырэктара прадпрыемства дапамагаць людзям звязана з яго асабістай гісторыяй. Барыс Іванавіч нарадзіўся ў Новасібірску ў 1945 годзе. Ужо ў 16 гадоў пайшоў працаваць. У маладосці здабываў алмазы ў Якуціі, потым паступіў ва Уральскі політэхнічны ўніверсітэт, а калі скончыў установу, то ўладкаваўся на Мінскі завод імя Арджанікідзэ. Інжынер-электроншчык у 1986 годзе падчас аварыі на АЭС адправіўся са сваёй брыгадай у Чарнобыль. Пасля небяспечнай камандзіроўкі захварэў і потым доўга лячыўся. Выжыў, але стаў інвалідам.

— Я бачыў, як здаровыя і моцныя людзі пасля атрымання інваліднасці згасалі на вачах. Гэта было вельмі цяжка, — успамінае Барыс Іванавіч. — Але здавацца я не хацеў. Я сабраў тых, хто тады страціў працу, і арганізаваў будаўнічую фірму. Нейкім цудам мне ўдалося знайсці і кантракты на будаўніцтва. І мы сталі зарабляць даволі добрыя грошы і годна жыць.

Але актыўнасць арганізацыі праз некалькі гадоў пачала падаць.

— Я разумеў, што надышоў час згортваць працу фірмы, — расказвае кіраўнік. — Але бяздзейнічаць не хацеў, не хацеў пакідаць магчымасць даваць людзям надзею на дастойнае жыццё. Тады я накіраваўся ў Беларускае таварыства інвалідаў і прапанаваў стварыць суменае прадпрыемства.

Але ў грамадскага аб'яднання ўжо было зарэгістравана прадпрыемства «Баркас», і Барысу Шчарбініну засталося толькі арганізаваць яго работу. Тады дырэктар і прыняў рашэнне ўкласці свае грошы і закупіць на іх швейнае абсталяванне.

Прадпрыемства працуе на рынку краіны ўжо 27 гадоў. Навучыць там могуць усіх, хто мае жаданне вярнуцца ў сваю прафесію ці атрымаць новую. Вядома, уладкаванне на працу праводзіцца з улікам дыягназу і нагрузкі. Само прадпрыемства, дзе працуюць людзі з абмежаванымі магчымасцямі, атрымлівае ад дзяржавы падатковыя льготы і невысокую арэндную плату на памяшканні.

— Мы ствараем людзям умовы не толькі для працы, — падкрэслівае дырэктар. — Праца ў нашым калектыве — гэта новыя знаёмствы, зносіны і развіццё сябе і сваіх навыкаў. Калі чалавек у нечым раней быў закамплексаваны, то ў нашым калектыве ён становіцца іншым.

Прадпрыемства «Баркас» выконвае важную сацыяльную функцыю па адаптацыі інвалідаў у грамадстве, а яшчэ пералічвае частку даходаў у БелТІ.

— Мой жыццёвы досвед паказвае наколькі важна такое грамадскае аб'яднанне, — гаворыць дырэктар «Баркаса». — Я ўпэўнены, што аднаму чалавеку з абмежаванымі магчымасцямі цяжка нечага дабіцца, а аб'яднаўшыся людзі адчуваюць моц. На базе БелТІ праходзяць маладзёжныя форумы, злёты, навучальныя семінары, дзе падказваюць, як адшукаць шлях да сябе. З дапамогай арганізацыі людзі патроху пачынаюць узаемадзейнічаць з грамадствам і ў выніку адчуваюць сябе карыснымі. Так што на хваробе жыццё не заканчваецца.

Інклюзія ў рэгіёнах

# Звярнуць увагу і дапамагчы адаптавацца

**Міжнародны дзень інвалідаў адзначаецца ва ўсім свеце штогод 3 снежня, і Беларусь не выключэнне. У розных краінах свету праводзяцца мерапрыемствы, якія павінны звярнуць увагу грамадства на праблемы людзей з абмежаванымі магчымасцямі і абараніць іх правы: семінары, выстаўкі, канцэрты, сустрэчы і акцыі. Днямі і ў Мінску прайшла канферэнцыя «Ад роўных правоў — да роўных магчымасцяў», дзе прысутным патлумачылі, якім чынам у Беларусі развіваюць інклюзіўнае асяроддзе.**

Так, **намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінаблвыканкама Наталля ІГНАТОВІЧ** расказала, што ў Мінскай вобласці каля 6 % ад агульнага насельніцтва — людзі з інваліднасцю. А гэта 90,4 тысячы чалавек, прычым амаль 7 % з іх дзеці.

«У Мінскай вобласці існуе савет па праблемах інвалідаў, у які ўваходзяць усе зацікаўленыя прадстаўнікі структур дзяржапарату. Савет створаны для комплекснага падыходу да вырашэння праблем такіх людзей. Гэтае пытанне пачынаецца ўжо з праектавання і будаўніцтва аб'ектаў, каб яны ў поўнай меры былі адаптаваны для ўсіх катэгорый насельніцтва», — адзначыла Наталля Ігнатовіч.

На тэрыторыі Мінскай вобласці функцыянуе 23 цэнтры, якія аказваюць розныя віды сацыяльнай дапамогі і працоўнай рэабілітацыі, дзе людзей з інваліднасцю навучаюць, напрыклад, навыкам прыгатавання ежы і бытавога догляду. Але нават не гэта галоўнае. Спецыяліст расказала, што зараз у актыўнай фазе работы знаходзяцца ўпраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў раёнах. Гэта звязана з тым, што з 2019 года дзейнічае не толькі практыка абвестак аб паслугах занятасці інвалідаў, але і суправаджальнае працаўладкаванне.

Фота БелТА

«На жаль, не кожны чалавек з інваліднасцю можа смела мець зносіны з наймальнікам, самастойна запоўніць анкету або скласці рэзюмэ, — кажа Наталля Ігнатовіч. — Тут дапамагаюць органы занятасці, якія на працягу трох месяцаў пасля працаўладкавання сочаць за тым, як чалавек адаптуецца на прадпрыемстве».

Працаўладкаванне інвалідаў — адна з самых важных мэт і Мінскай абласной арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства інвалідаў».

«Наша дасягненне — гэта цеснае ўзаемадзеянне арганізацыі з дзяржструктурамі ў сферы працаўладкавання людзей з інваліднасцю, — падкрэсліла **спецыяліст Мінскай абласной арганізацыі ГА «БелТІ» Алеся АЛЯХНОВІЧ**. — Упраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне сапраўды вельмі дапамагае нам ва ўзаемадзеянні з прадпрыемствамі, на якіх уладкаваны інваліды. У нашай абласной арганізацыі пяць такіх прадпрыемстваў. Каля 50 працаўнікоў на гэтых прадпрыемствах, у тым ліку іх кіраўнікі, — людзі з інваліднасцю. Дзяржаўныя структуры ўвогуле хутка рэагуюць на запыты нашага аб'яднання, і такое ўзаемадзеянне прыносіць свой плён».

Так, па выніках 10 месяцаў у раёне былі працаўладкаваны 195 людзей з інваліднасцю. Арганізавана навучанне розным спецыяльнасцям, запатрабаваным на рынку працы.

Наталля Ігнатовіч дадала, што да актыўных мер занятасці адносіцца і падтрымка прадпрымальніцкай дзейнасці, выдача субсідый.

«У гэтым годзе пяць чалавек атрымалі субсідыі на развіццё прадпрымальніцкай і рамесніцкай дзейнасці. Для сельскага насельніцтва субсідыя складае 15 бюджэтаў пражытачнага мінімуму, а для гарадскога — 11. Гэтыя грошы можна выкарыстоўваць для набыцця матэрыялаў і абсталявання», — сказала яна.

Таксама адзначалася, што існуе яшчэ адзін кірунак у дзейнасці камітэта — адаптацыя інваліда на рабочым месцы.

«Гэта выкарыстоўваецца як на звычайных прадпрыемствах, так і на профільных. Такім чынам чалавек атрымлівае прафесійныя навыкі працы і замацоўваецца на вытворчасці. Ён набывае практычны вопыт, які дазваляе праявіць сябе, а наймальнік мае магчымасць разгледзець патэнцыйнага працаўніка», — падзялілася Наталля Ігнатовіч.

Падводзячы вынікі, яна звярнула ўвагу, што новы законапраект аб правах інвалідаў і сацыяльнай інтэграцыі ўключыў у сябе шмат дапаўненняў і змяненняў. У тым ліку кватаванне працоўных месцаў, якія дадуць у перспектыве нашмат больш магчымасцяў для сацыялізацыі.

**Матэрыялы падрыхтавала Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении 15 декабря 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)* |
|---|
| Нефтепродукт – обводненное (с примесями) сырье для производства нефтяных вязких дорожных битумов в количестве 1 100 тонн (ориентировочно), содержащийся в битумохранилище, расположенном по адресу: Минская область, Вилейский район, г. Вилейка, ул. Волкова, 43 |
| Начальная цена: 136 400,00 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка: 13 600,00 бел. руб. |

** Покупатель обязуется своими силами, средствами и за свой счет произвести вскрытие битумохранилища, выемку содержимого (продаваемого имущества) и вывоз с территории производственной базы. Окончательное количество продаваемого имущества определяется по мере выборки нефтепродукта с учетом его контрольного взвешивания.*

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **15 декабря 2021 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 06.12.2021 по 13.12.2021 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону **(017) 388-43-21.**

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

---

08.12.2021 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Гомельжилпроект».

Повестка дня:

1. О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Гомельжилпроект»: г. Гомель, ул. Кирова, 17.
Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Кирова, 17.
Время регистрации – в день проведения собрания с 13.30 до 14.00.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни начиная с 03.12.2021 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.
Дата сбора реестра акционеров – 01.12.2021 г.

Наблюдательный совет.

УНН 400022625

---

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5** |
| **Продавец** | **ОАО «Ивацевичдрев», Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. Загородная, 2** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронного аукциона** (одним лотом) –
**ПРОИЗВОДСТВЕННАЯ БАЗА,**
расположенная по адресу: **Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. Гойшика, 33**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес (№ дома) |
|---|---|---|---|
| **Административное здание** (составные части и принадлежности: холодная пристройка) | 178,6 кв. м | 122/С-14547 | д. 33 |
| **Здание оперативного обслуживания на АЗС** | 10,5 кв. м | 122/С-21382 | д. 33/6 |
| **Здание под операторскую на АЗС** | 4,2 кв. м | 122/С-21383 | д. 33/5 |
| **Здание склада** | 26,8 кв. м | 122/С-21381 | д. 33/4 |
| **Котельная** (составные части и принадлежности: дымовая труба) | 33,6 кв. м | 122/С-14548 | д. 33/1 |
| **Склад для дров** | 52,1 кв. м | 122/С-21618 | д. 33/7 |
| **Шиномонтажный пост** | 31,2 кв. м | 122/С-21262 | д. 33/2 |
| **Производственный корпус** | 874,6 кв. м | 122/С-14550 | д. 33 |
| **Столярный цех, гараж** (составные части и принадлежности: две пристройки) | 1750,5 кв. м | 122/С-14546 | д. 33 |

**Перечень иного имущества, входящего в состав лота:** цистерна 5222 л (инв. № 0624/1), цистерна 4927 л (инв. № 0624/2), колонка топливо-раздаточная Шельф -100 (инв. № 205), домик вагонного типа (инв. № 150386), металлич. ворота, 2 шт. (инв. № 9954, 9953), заборное ограждение ж/б плиты (инв. № 9951), ограждение ГСМ. сетка рабица (инв. № 9950), котел водогрейный 95 кВт (инв. № 9507/3), монитор LG LCD 19M3A-B (инв. № 2761), регистратор LS XVR 0404 (инв. № 2760), камера LS 20/60 (инв. № 2759), камера LS 20/60, 7 шт. (инв. №№ 2758, 2757, 2756, 2755, 2754, 2753, 2752), туалет деревянный (инв. № 2539), домик вагонного типа (инв. № 2538), забор из металлопрофиля (инв. № 2519), колонка топливо-раздаточная Шельф -100 (инв. № 206), котел отопительный (инв. № 0633), емкость-цистерна (инв. № 0421), цистерны 2 штуки (инв. № 0613/1, № 0613/2)

***Сведения о земельном участке:*** пл. **3,1238 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания административного здания, гаражей, производственного корпуса, складов, диспетчерской, строений и сооружений автомобильной заправочной станции, котельной

**Начальная цена с НДС 20 % – 496 840,29 бел. руб.**
(снижена на 30 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 1 (один) % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» 11.11.2021

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов: 21.12.2021 в 11.00. Окончание торгов: 21.12.2021 в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 20.12.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 420/С-52817 (назначение – здание специализированное складов, хранилищ, наименование – здание склада), площадью 806,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. 8 Марта, 28А.**

ЛОТ 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 423650100007001037 (назначение – для обслуживания здания склада), площадью 0,1290 га по адресу: г. Лида, ул. 8 Марта, 28А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, расположенный в охранной зоне сетей и сооружений водоснабжения, код – 13,4, площадью 0,0136 га.
Начальная цена продажи – 162 720 руб. (сто шестьдесят две тысячи семьсот двадцать рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 16 272 руб. (шестнадцать тысяч двести семьдесят два рубля)

Условия аукциона:
- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по проведению независимой оценки объекта в размере 419,10 руб.;
- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца за составление выписки из регистрационной комиссии о правах (ограничениях и обременениях) прав на объект в размере 29,0 руб.;
- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведения аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 3 % от конечной цены продажи объекта

**Продавец – Открытое акционерное общество «Лидская обувная фабрика», 231300, Республика Беларусь, Гродненская обл., г. Лида, ул. Фабричная, 6, тел. 8 (0154) 52-16-61**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833220001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 14 декабря 2021 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» 29.09.2021 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 10 декабря 2021 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», https://grino.by/aukcion/**

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

**ЛОТ № 1: капитальное строение с инвентарным номерам 401/С-11729, расположенного по адресу: Гродненская область, Гродненский район, ул. Карла Маркса, д. 1, площадь – 14,2 кв. м, назначение – одноэтажное кирпичное здание проходной, наименование – одноэтажное кирпичное здание проходной**

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 422050400002001886, находящемся по адресу: Гродненская область, Гродненский район, г. Скидель, ул. Карла Маркса, д. 1, площадь – 0,0393 га, назначение – земельный участок для эксплуатаций и обслуживания складов.
Начальная цена продажи лота – 4 000 руб. (четыре тысячи рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 400 руб. (четыреста рублей)

**ЛОТ № 2: капитальное строение с инвентарным номерам 401/С-32188, расположенного по адресу: Гродненская область, Гродненский район, г. Скидель, ул. Ленина, 5/1, площадь – 29,0 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад и капитальное строение с инвентарным номерам 401/D-8010, расположенного по адресу: Гродненская область, Гродненский район, г. Скидель, ул. Ленина, 5-2, площадь – 518,1 кв. м, назначение – производственное помещение, наименование – колбасный цех.**

Лот № 2 расположен на земельном участке, кадастровый номер 422050400020000459, находящемся по адресу: Гродненская область, Гродненский район, г. Скидель, ул. Карла Маркса, д. 1, площадь – 0,1503 га, назначение – земельный участок для эксплуатаций и обслуживания складов.
Начальная цена продажи лота – 43 200 руб. (сорок три тысячи двести рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 4 320 руб. (четыре тысячи триста двадцать рублей)

**Продавец – Щучинский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231513, г. Щучин, ул. Пушкина, 26, тел. (801514) 28-1-50**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70, 55-87-71**

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 28 декабря 2021 г. в 10.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Щучин, ул. Пушкина, 26**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 22.09.2021 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 24 декабря 2021 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion/**

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Слуцкий Агросервис» (продавец) ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА В СОСТАВЕ:

**Лот № 1: СКЛАД 3000 т**
*(составные части и принадлежности: 2 (две) опоры, резервуар, навес)*
**общей площадью 386,4 кв. м с инв. № 640/С-114326.**
*Объект обременен договором аренды по 31.05.2025.*
**Начальная цена** с НДС (20 %) **– 168 000,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – (**16 800,00** бел. руб.)
***(Цена снижена на 20 %).***

**Лот № 2:**
**ПУНКТ ТЕХНИЧЕСКОГО ОБСЛУЖИВАНИЯ**
**общей площадью 341,9 кв. м с инв. № 640/С-114325.**
**Начальная цена** с НДС (20 %) **– 16 704,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – (**1 671,00** бел. руб.)
***(Цена снижена на 20 %).***

**Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 624650100001006033 (право постоянного пользования) площадью 18,7560 га по адресу: Минская область, Слуцкий район, Козловичский с/с, 6, юго-западнее аг. Козловичи. Для обслуживания каждого из объектов будет выделена доля в праве на земельный участок с кадастровым номером 624650100001006033.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55B PSB30121082600169330000 в ОАО «Сбербанк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в следующем размере: по лоту № 1 – 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, по лоту № 2 – 5 (пяти) процентов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 23.10.2021.

Аукцион состоится **15.12.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14.12.2021** до **16.00** в каб. 320 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11. Тел. для осмотра (8044) 545 37 36.**

УНП 600043896

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
3 снежня 2021 г. № 47 (632)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ІНІЦЫЯТЫВА

Фота з архіва Краснапольскага райсавета дэпутатаў.

# ГОРЫ — СТАЛІЦА СЕЛЬСКАГА БІЗНЕСУ

**У аграгарадку Краснапольскага раёна адсвяткавалі адкрыццё Цэнтра маркетынгу і сыраварства «Малочны куфэрак».**

Летась у жніўні ініцыятыўныя жыхары з Горскага, Тур'еўскага і Сідараўскага сельсаветаў Краснапольскага раёна стварылі першы цалкам жаночы спажывецкі кааператыў «Горская скарбніца». Чарговае дасягненне актыўных вясковак — адкрыццё Цэнтра маркетынгу і сыраварства. Гэта стала магчыма, дзякуючы падтрымцы мясцовай улады і раённых арганізацый. У адкрыцці Цэнтра ўзялі ўдзел старшыня Краснапольскага райвыканкама Аляксандр Трушкін і старшыня абласнога Савета дэпутатаў Ірына Раінчык.

«Малочны куфэрак» размясціўся ў раней пустуючым будынку комплекснага прыёмнага пункта агульнай плошчай 115 квадратных метраў. Частковы рамонт і замену вокнаў у ім зрабіў на партнёрскіх дамоўленасцях краснапольскі «Жылкамунгас». На даху будынка ўстаноўлены сонечныя батарэі. Так што для функцыянавання Цэнтра будзе выкарыстоўвацца выключна нізкавугляродная энергія.

— Горскі сельскі Савет пачаў удзельнічаць у рэалізацыі мясцовых праектаў і ініцыятыў яшчэ ў 2014 годзе, — адзначыла **старшыня Краснапольскага райсавета дэпутатаў Анжаліка ГОМАН.** — Цяпер ён з'яўляецца прыкладам для жыхароў іншых рэгіёнаў у рашэнні задач устойлівага развіцця мясцовых тэрыторый, пытанняў занятасці і самазанятасці насельніцтва. Кааператыў «Горская скарбніца» супрацоўнічае з сыраварамі Слаўгарадскага і Чэрыкаўскага раёнаў. Адным з напрамкаў яго работы з'яўляецца распрацоўка і прасоўванне брэнда мясцовай прадукцыі. І Цэнтр маркетынгу і сыраварства дасць магчымасць папулярызаваць дзейнасць суполкі найбольш эфектыўна.

На тэрыторыі мікрарэгіёна маецца вялікі патэнцыял для развіцця турызму. Тут размешчаны маляўнічае Палужскае вадасховішча агульнай плошчай 136 гектараў, заказнік «Ясеневы гай», Горская святая крыніца, вінакурны завод XVIII стагоддзя. Для знаёмства з гэтымі і іншымі славутасцямі распрацаваны тры турыстычныя маршруты, на стадыі адкрыцця знаходзіцца некалькі аграсядзіб. Тут захоўваюць і развіваюць народныя традыцыі. На Дзесятуху (10-я пятніца пасля Уваскрашэння Хрыста) каля Горскай святой крыніцы праводзіцца аўтэнтычнае свята. Вада ў гэты дзень набывае тут асаблівыя ўласцівасці і моц. Побач з крыніцай знаходзіцца капішча старажытнага племені славян — радзімічаў. І ўсё гэта ў непасрэднай блізкасці ад аграгарадка, дзе «прапісаўся» Цэнтр маркетынгу і сыраварства.

На базе Цэнтра сфарміраваны абменны фонд абсталявання і матэрыяльных рэсурсаў, якія будуць закупленыя за кошт сродкаў праекта. Тут жа знаходзіцца міні-цэх, дзе мясцовае насельніцтва зможа навучыцца асновам вытворчасці сыру. Гэта, як той казаў, «вуда» для селяніна, з дапамогай якой ён зможа павысіць свой матэрыяльны дабрабыт, а заадно зрабіць рэкламу малой радзіме. Стаўка робіцца на актыўных людзей, якія змогуць забяспечваць натуральнымі прадуктамі не толькі сябе, але і іншых.

Да ведама, у Горскім сельсавеце налічваецца 113 асабістых падсобных гаспадарак, якія займаюцца вытворчасцю малака, тварагу, сыру, яек, мёду, бульбы, мяса. Толькі ў аграгарадку Горы свая гаспадарка ёсць у кожнага трэцяга жыхара.

Для Цэнтра маркетынгу і сыраробства набытыя мэбля і ўсё неабходнае абсталяванне для прыгатавання свойскай смакаты, у тым ліку дзве электрычныя міні-сыраварні аб'ёмам да 60 літраў і расходныя матэрыялы для вытворчасці сыру (закваскі, формы, ферменты, сепаратары, маслабойкі, даільныя апараты). На базе Цэнтра ў далейшым будуць праводзіцца інфармацыйна-адукацыйныя і практычныя мерапрыемствы па выкарыстанні і ўкараненні нізкавугляродных тэхналогій у дзейнасці гаспадарак, а таксама будзе рэалізавана спецыяльная навучальная праграма па павышэнні маркетынгавай прывабнасці брэнда «Малочны куфэрак». Асноўныя дасягненні праекта — стварэнне і папулярызацыя экалагічнай прадукцыі і прапаганда нізкавугляроднай вытворчасці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

АКТУАЛЬНА

# БЕЛАРУСЬ — ГЭТА МЫ!

**У музеі Савета Рэспублікі арганізавана фотавыстаўка «Беларусь — Радзіма», прысвечаная старшынству Рэспублікі Беларусь у Садружнасці Незалежных Дзяржаў і Году народнага адзінства.**

Экспазіцыя складае ўнікальны партрэт нашай краіны, сабраны, як мазаіка, з фатаграфій любімых мясцін слухачоў і гледачоў тэлерадыёкампаніі «Мір». За кожным са здымкаў знаходзіцца асабістая гісторыя чалавека, які нарадзіўся і жыве ў Беларусі.

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА,** знаёмячыся з фотавыстаўкай «Беларусь — Радзіма», адзначыла, што такія праекты сведчаць: мы жывём у выдатнай краіне.

— У фотаздымках, якія сёння прадстаўлены на выстаўцы, адлюстравана любоў да сваёй Радзімы. Яны прасякнутыя звычайным чалавечым пачуццём, якое называецца шчасце. Дзякуй вялікі тэлекампаніі «Мір» за такую цудоўную ідэю і за тое, што сёння гэтая выстаўка знаходзіцца ў Савеце Рэспублікі, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Нашы сенатары змаглі азнаёміцца з выдатнымі работамі, якія прадстаўлены тут. Я думаю, што гэтая ідэя павінна быць падтрыманая і іншымі нашымі тэлекампаніямі, каб як мага больш людзей магло паўдзельнічаць. Упэўненая, конкурс знайшоў водгук у многіх грамадзян, таму што мы любім нашу краіну. Гэтыя фотаработы чарговы раз пацвердзілі: мы жывём у выдатнай і цудоўнай краіне, дзе жывуць разумныя, добрыя і прыгожыя людзі.

# ПРАЦАВАЦЬ ВА ЎНІСОН

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава на нарадзе ў Мінгарвыканкаме заклікала дэпутатаў сталіцы далучацца да пытання тлумачэння людзям важнасці таго, што трэба працаваць для напаўнення бюджэту горада.**

Паводле слоў кіраўніка верхняй палаты парламента, такія сустрэчы ў фармаце дыялогавай пляцоўкі сёлета прайшлі ва ўсіх рэгіёнах краіны.

— Сёння як ніколі павінна быць выбудаваная выразная работа ва ўзаемасувязі выканаўчай улады і дэпутацкага корпуса, — пераканана яна. — Ад дэпутатаў усіх узроўняў патрабуецца актыўная жыццёвая пазіцыя і дзейнасць на апярэджанне праблем выбаршчыкаў. Яны даверылі вам рашэнне гэтых пытанняў. Мы павінны працаваць ва ўнісон.

Яна спынілася на эканамічных пытаннях, паколькі эканоміка на чале ўсяго. Спікер Савета Рэспублікі лічыць першасным выкананне прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця, асабліва ў той час, калі да Беларусі прымяняецца шэраг санкцый. Яна дадала, што па ўсіх рэгіёнах сітуацыя прыкладна аднолькавая: выконваюцца ўсе паказчыкі, акрамя аднаго — інвестыцыі ў асноўны капітал.

Ад эфектыўнай дзейнасці прадпрыемстваў, прычым працы не на склад, а з прыбыткам, залежыць рэалізацыя сацыяльных задач — забеспячэння бяспекі людзей, даступнасці і якасці паслуг аховы здароўя і адукацыі і гэтак далей.

— Каб фарміраваць бюджэт, людзі павінны працаваць, — рэзюмавала Наталля Качанава. — І тлумачыць гэта — задача дэпутацкага корпуса ў тым ліку.

# КАДРЫ ВЫРАШАЮЦЬ УСЁ!

## Патрабаванні да кіраўнікоў і работнікаў стануць больш сур'ёзнымі

**На чарговай сесіі Савета Рэспублікі сенатары падтрымалі змены ў адпаведны дэкрэт Прэзідэнта, накіраваны на павышэнне кадравага патэнцыялу і кадравай бяспекі ў краіне. Аб навацыях падрабязна сенатарам расказала міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ:**

— Пытанні кадравай палітыкі, працоўнай і выканаўчай дысцыпліны аказвае самы непасрэдны ўплыў на эфектыўнасць работы арганізацый, — адзначыла міністр і нагадала, што сёння ў Дэкрэце кіраўніка дзяржавы № 5 ужо замацаваны шэраг дзейсных механізмаў, накіраваных на ўдасканаленне работы па падборы і расстаноўцы ўпраўленчых кадраў.

У прыватнасці, гэтым дакументам замацаваны пералік дыскрэдытуючых падстаў для звальнення. Таксама прадугледжана норма, згодна з якой асобы, звольненыя на дыскрэдытуючых падставах, на працягу пяці гадоў пасля звальнення не могуць прызначацца на пасады, уключаныя ў кадравыя рэестры кіраўніка дзяржавы, Савета Міністраў, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. Разам з тым яны могуць быць прызначаны на кіраўнічыя пасады арганізацыі незалежна ад формы ўласнасці, але толькі пасля ўзгаднення з кіраўнікамі мясцовых органаў улады.

Дэкрэтам № 5 у рэдакцыі 2014-га наймальніку даецца права пры прыёме на работніка запрошваць характарыстыку з папярэдніх месцаў яго працы.

— Аднак існуючыя нормы Дэкрэта № 5 у частцы рэгулявання прыёму на работу закранаюць нязначную частку работнікаў, паколькі звальненні па дыскрэдытуючых падставах не носяць масавы характар, — адзначыла Ірына Касцевіч. — Працаўладкаванне асноўнай масы работнікаў ажыццяўляецца на падставе агульных палажэнняў Працоўнага кодэкса.

Яна нагадала, што падзеі мінулага года паказалі неабходнасць прыняцця дадатковых мер, у тым ліку і заканадаўчых, па недапушчэнні пранікнення ў дзяржаўныя органы і арганізацыі дэструктыўна настроеных грамадзян, якія адкрыта выступаюць супраць палітычнага курса дзяржавы. Менавіта таму Дэкрэтам № 6 прадугледжваецца шэраг дадатковых механізмаў, накіраваных на ўмацаванне адказнасці як кіраўнікоў, так і работнікаў, у першую чаргу дзяржаўных органаў, дзяржаўных арганізацый і арганізацый з доляй уласнасці дзяржавы больш за 50 %.

Новым дакументам прадугледжваецца абавязак наймальніка (а не права пры жаданні, і ў гэтым істотная розніца) пры прыёме на работу ў дзяржаўныя органы і арганізацыі запрошваць характарыстыку на работніка з папярэдняга месца працы, а таксама з дзяржаўнай арганізацыі, дзе ён працаваў на працягу папярэдніх пяці гадоў. Дарэчы, калі за гэты перыяд было зменена некалькі дзяржаўных арганізацый, тады характарыстыка запрошваецца з апошняга.

Акрамя таго, у адносінах да кандыдатаў на кіраўнічыя пасады (не толькі першай

асобы, але і яе намеснікаў) прадугледжаны абавязак наймальніка запрошваць даныя з Адзінага дзяржаўнага банка правапарушэнняў.

Адначасова Дэкрэтам № 6 замацоўваюцца патрабаванні да характарыстыкі і тэрмінах яе выдачы. Так, характарыстыка з'яўляецца афіцыйным дакументам, у якім павінны адлюстроўвацца прафесійныя, дзелавыя і маральныя якасці работніка; інфармацыя аб прыцягненні да дысцыплінарнай і іншай адказнасці, здзяйсненні дзеянняў, якія супярэчаць дзяржаўным і грамадскім інтарэсам. Пры накіраванні запыту характарыстыка павінна выдавацца на працягу сямі каляндарных дзён. Дарэчы, і форма яе ўжо зацверджана пастановай урада.

Трэба сказаць, што замацоўваецца і адказнасць выканаўцаў пры ажыццяўленні ўсіх этапаў працаўладкавання такіх кандыдатаў. Адзначым, што, калі дзеянні нанеслі шкоду дзяржаўнай маёмасці ці істотную шкоду дзяржаўным і грамадскім інтарэсам, адпаведныя службовыя асобы будуць несці адказнасць у адпаведнасці з Крымінальным кодэксам.

— Такім чынам, Дэкрэтам № 6 наймальнікам даюцца дзейсныя механізмы атрымання інфармацыі аб кандыдаце на заняцце пасады, — пераканана Ірына Касцевіч.

Акрамя таго, яна звярнула ўвагу на тое, што нормы Дэкрэта № 5 прыведзены ў адпаведнасць з Законам «Аб змене законаў па пытаннях працоўных адносінаў» ад 28 мая бягучага года, якім унесены змены ў Працоўны кодэкс.

У прыватнасці, пашыраны паўнамоцтвы наймальніка. Ён атрымаў права адхіляць работніка ад работы, калі той заклікае іншых работнікаў да спынення працы без уважлівых прычын.

Міністр таксама нагадала, што ў Працоўны кодэкс уведзена новая падстава для звальнення — парушэнне работнікам парадку збору, сістэматызацыі, захоўвання, змены, выкарыстання, абязлічвання, распаўсюджвання, прадстаўлення і выдалення персанальных даных.

— Дадзеная падстава звальнення аднесена да дыскрэдытуючых падстаў, што замацавана ў дэкрэце, — патлумачыла яна і папрасіла членаў Савета Рэспублікі падтрымаць дакумент.

Падчас абмеркавання праекта Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла значэнне ролі кіраўніка. Ён павінен разумець сваю адказнасць пры прыняцці кадравых рашэнняў. Наталля Качанава азначыла своечасовасць прыняцця змяненняў у дэкрэт.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# МІЖНАРОДНЫЯ ПРАВЫ І ЗДАЧА НА «АЎТАМАЦЕ»

## Якія змены прадугледжваюцца ў Законе «Аб дарожным руху»?

**Аб гэтым на чарговай сесіі Савета Рэспублікі расказаў сенатарам міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ.**

Паводле яго слоў, мэтай змен з'яўляецца ўдасканаленне прававых і арганізацыйных асноў дарожнага руху.

— Разам з мерамі па павышэнні дарожнай бяспекі прадугледжаны шэраг палажэнняў, накіраваных на стварэнне больш камфортных умоў для ўдзелу грамадзян у дарожным руху, а таксама забеспячэння іх правоў і законных інтарэсаў, — патлумачыў міністр.

Разбяромся разам, што за навацыі нас чакаюць.

**Па-першае**, у якасці новага дакумента, які сведчыць права кіравання транспартнымі сродкамі, прадугледжана выдача **міжнароднага пасведчання кіроўцы**.

— Гэтая неабходнасць абгрунтавана пэўнымі цяжкасцямі, якія ўзнікаюць у беларускіх грамадзян за мяжой, — кажа Іван Кубракоў і ў якасці прыкладу прыводзіць немагчымасць узяць машыну напракат у некаторых краінах без міжнароднага пасведчання ці наогул прыраўноўванне кіроўцаў без гэтага дакумента да асоб, якія не маюць права кіравання.

Паводле слоў міністра, адпаведная працэдура ўжо ўключана ў пералік адміністрацыйных працэдур, якія выконваюцца дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі па заявах грамадзян.

**Па-другое**, грамадзяне Расійскай Федэрацыі змогуць захаваць права кіраваць транспартнымі сродкамі на падставе свайго **нацыянальнага пасведчання** да сканчэння тэрміну яго дзеяння незалежна ад атрымання імі віду на жыхарства ці грамадзянства Беларусі. Робіцца гэта для забеспячэння

роўных правоў грамадзян Саюзнай дзяржавы.

Зараз, у прыватнасці, пры атрыманні віду на жыхарства ці пашпарта Рэспублікі Беларусь расіяне абавязаны на працягу 90 дзён замяніць сваё нацыянальнае пасведчанне кіроўцы, інакш яны прыраўноўваюцца да асоб, якія не маюць права кіравання.

**Па-трэцяе**, з'явіцца магчымасць навучання, здачы практычнага кваліфікацыйнага экзамену і атрымання права кіравання транспартнымі сродкамі **без механічнай трансмісіі**. На думку распрацоўшчыкаў законапраекта, гэта адпавядае пажаданням тых кіроўцаў, якія плануюць у далейшым кіраваць толькі такімі транспартнымі сродкамі.

— З улікам прыманых дзяржавай мер па папулярызацыі выкарыстання электрамабіляў прапанаваная навацыя таксама павінна садзейнічаць распаўсюджванню ў краіне гэтага віду транспарту, — пераканаў міністр.

**Па-чацвёртае**, аўташколы **перастануць узгадняць маршруты** для практычнага навучання курсантаў з ДАІ. Робіцца гэта дзеля ўдасканалення вучэбнага працэсу па практыцы кіравання аўтамабілем. Пры гэтым Міністэрства ўнутраных спраў атрымае паўнамоцтвы па вызначэнні ўчасткаў дарог, па якіх навучанне будзе забаронена.

— Гэтая навацыя дазволіць скасаваць адпаведную адміністрацыйную працэдуру, — патлумачыў міністр.

Ён таксама расказаў, што праектам закона прадугледжваецца вызначэнне асноўных параметраў дарожнага руху, ажыццяўлення яго маніторынгу і прынцыпаў яго арганізацыі. І гэта ўжо пятая навацыя.

— З'яўляецца магчымасць кіравання дарожным рухам і яго рэгулявання дзякуючы інтэлектуальным транспартным сістэмам, выкарыстанне якіх дазволіць аператы ўна ўплываць на змену дарожнай абстаноўкі і інфармаваць аб гэтым удзельнікаў дарожнага руху, — кажа Іван Кубракоў.

У якасці прыкладу ён прывядзіць знакі пераменнай інфармацыі (ці інакш — электронныя табло), якія загадзя ў рэжыме рэальнага часу могуць інфармаваць кіроўцу аб небяспецы наперадзе: ДТЗ, будаўнічых работах, заторах ці іншых фактарах.

Паводле слоў міністра, такія знакі разам з інфармаваннем змогуць усталёўваць і пэўныя абмежаванні для дарожнага руху ў выпадку змены дарожнай абстаноўкі. Напрыклад, змяншаць хуткасць на некаторых участках пры ўзнікненні небяспекі для руху.

**Нарэшце**, трэба сказаць і аб пэўных зменах, якія датычацца медыцынскага забеспячэння дарожнага руху.

Як расказаў Іван Кубракоў, для аператыўнага і цэнтралізаванага адсочвання інфармацыі аб выдадзеных медыцынскіх даведках кіроўцам, якія пацвярджаюць іх прыдатнасць да кіравання транспартнымі сродкамі ці, наадварот, прызнаных непрыдатнымі да гэтага, на Міністэрства аховы здароўя ўскладаецца абавязак весці ўлік гэтых звестак і прадставіць доступ да інфармацыі МУС і Мінсельгасхарчу.

— Гэта дазволіць вырашыць адразу дзве задачы: выключыць неабходнасць прадстаўлення медыцынскай даведкі пры выкананні адпаведных адміністратыўных працэдур, а таксама дазволіць своечасова размяшчаць у аўтаматызаваную інфармацыйную сістэму ДАІ звесткі аб асобах, якія не маюць права кіравання транспартнымі сродкамі па медыцынскіх паказаннях, — пераканаў міністр.

Пералік навацый на гэтым не заканчваецца, але з'яўляецца больш дробязным, таму на гэтым і абмяжуемся.

Напрыканцы Іван Кубракоў дадаў, што прыняцце Закона «Аб дарожным руху» не патрабуе дадатковых бюджэтных сродкаў, звязаных з яго рэалізацыяй.

Па словах **старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіла РУСАГА**, прадугледжаныя праектам закона змены накіраваны на вырашэнне спрэчных пытанняў правапрымянення, павышэнне бяспекі і эфектыўнасці дарожнага руху, што павінна спрасціць і жыццё кіроўцаў.

Калегі па сенатарскім корпусе пагадзіліся з выступоўцам і падтрымалі законапраект.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

На адной хвалі

# ПАЗНАЁМ МАСТАЦТВА Ў НОВЫМ ФАРМАЦЕ

**Канал «Культура» Беларускага радыё сумесна з Нацыянальным мастацкім музеем Рэспублікі Беларусь распачалі спецыяльны праект «Дыялогі пра культуру: Перадзвіжнікі», які знаёміць слухачоў з жыццём і творчасцю мастакоў-перадзвіжнікаў.**

Сёлета 29 лістапада споўнілася 150 гадоў з моманту першай экспазіцыі рускага Таварыства перасоўных мастацкіх выставак. Пад знакам юбілею ў Нацыянальным мастацкім музеі адкрыўся праект «Перадзвіжнікі. Рэалізм. Асвета. Бізнес». У праграму ўключаны радыёсустрэчы з навуковымі супрацоўнікамі музея, куратарамі, экскурсаводамі. Кожная перадача будзе прысвечана асобнай тэме: партрэт, бытавы жывапіс, пейзаж, бізнес у дзейнасці перадзвіжнікаў, уплыў мастакоў таварыства на іншыя віды мастацтва.

— Супрацоўніцтва канала «Культура» з Нацыянальным мастацкім музеем пастаянна развіваецца. У эфіры мы асвятляем часовыя выставачныя праекты, запрашаем музейных работнікаў на перадачы, дзе гутарым пра фонды, шэдэўры з калекцыі ўстановы, асаблівасці нацыянальнага выяўленчага мастацтва, — адзначае **дырэктар канала «Культура» Беларускага радыё Уладзімір ТРАПЯНОК.** — А праект-падкаст — гэта новая форма нашага ўзаемадзеяння з музеем, гібрыдны праект, закліканы прыцягнуць увагу сучаснікаў да сапраўднага мастацтва, здольнага натхняць і ўзвышаць чалавека.

Спецыяльны праект, які складаецца з шасці выпускаў, стартаваў у эфіры канала «Культура» 2 снежня ў 12.30, а працяг аўдыторыя зможа слухаць па чацвяргах. Падкасты радыёсустрэч будуць змешчаны і на YouTube-канале, у сацыяльных сетках «Культуры» і Нацыянальнага мастацкага музея. Адкрывайце мастацтва з новых ракурсаў!

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 134

Аўтар сённяшняй задачы — Мікалай Бантыш з Віцебска *(гл. дыяграму)*.

**Белыя:** Крh6, Фс4, Кb3, пf7 (4).

**Чорныя:** Крe5, Кс2, пf5 (3).

Мат за 2 хады.

Прапануем чытачам гэтую задачу для самастойнага рашэння. Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Нашы пастаянныя чытачы ўжо добра знаёмыя з творчасцю беларускіх шахматных кампазітараў Міхаіла Кошаля і Мікалая Быкава. Іх задачы паспяхова ўдзельнічаюць і ў міжнародных конкурсах.

Двухходавая мініяцюра М. Кошаля атрымала пахвальны водгук у конкурсе расійскага часопіса «Шахматная кампазіцыя».

**Белыя:** Крa4, Фh1, Ле4, Се3, Ке8 (5).

**Чорныя:** Крd5, пс7 (2).

Спачатку гатовая гульня 1... Крс6 2. Ле7х Не вядуць да мэты падманныя сляды: 1. Крb3? ~ 2. Ле7х, але 1...Крс6!; 1. Кf6+? Крс6 2. Ле6х, але 1... Крd6!; 1. Фh7? с6 2. Ф:f5х, 1... с5 2. Фb7х, але 1...Крс6! Рашае 1. Фb1! Крс6 2. Фb5х, 1... с6 2. Фd3х, 1...с5 2. Фb7х.

Двухходоўка М. Быкава атрымала пачэсны водгук у маскоўскім конкурсе.

**Белыя:** Крh5, Фе6, Лb3, Сb1, Ке2, Ке5, пп. с2, с4, d4 (9).

**Чорныя:** Крe4, Ла5, Са3, Сf5, Кb6 (5).

1. Лg3? ~ 2. с3х, 1...Cg4+ 2. Ф:g4х, 1...Cg6+ 2. Ф:g6х, але 1...Лb5! Рашае 1. с5! ~ 2. с4х, 1...Cg4+ 2. К:g4х, 1...Cg6+ 2. К:g6х, 1...Кс4 2. Фс6х.

* * *

У турніры на прызы прэзідэнта Узбекістана ў Ташкенце (103 удзельнікі) Міхаіл Нікіценка заняў 10-е месца, Вячаслаў Зарубіцкі — 22-е, Аляксей Аляксандраў — 33-е. У бліцтурніры на сайце chess.com (538 гульцоў) Сяргей Жыгалка быў трынаццаты, Дзяніс Лазавік — сямнаццаты. Прызавую тройку спартакіяды Беларусі сярод спартыўных школ склалі каманды Баранавіцкай ДЮСШ, Мінскай і Магілёўскай абласной СДЮШАР.

* * *

Прапануем чытачам некалькі сёлетніх партый беларускіх шахматыстаў.

Аляксей Фёдараў — Данііл Лінчэўскі (Чэлябінск, 2021). 1. e4 e5 2. Kf3 Kf6 3. d3 Kc6 4. g3 d5 5. ed K:d5 6. Cg2 Ce7 7. 0-0 Kb6 8. Ле1 f6 9. a4 a5 10. Kc3 0-0 11. Kb5 Kb4 12. d4 c6 13. Ka3 Cg4 14. c3 K4d5 15. h3 Ch5 16. Kc2 Cg6 17. Kh4 Фd7 18. K:g6 hg 19. Фd3 ed 20. Ф:g6 dc 21. Kd4 Cb4 22. Ce4 f5 23. C:f5 Л:f5 24. K:f5 Kpf8 25. K:g7 cb 26. Ch6 Cd2 27. Ke6+ Крe7 28. Кc5+ Крd8 29. K:d7 baФ 30. Л:a1, 1:0.

Вольга Бадэлька — Ганна Саргсян (Рыга, 2021). 1. e4 e5 2. Kf3 Kc6 3. Cb5 a6 4. Ca4 d6 5. 0-0 Cd7 6. c3 g6 7. d4 Cg7 8. Ле1 Kge7 9. Ce3 0-0 10. Kbd2 h6 11. Cc2 e4 12. cd g5 13. d5 Ke5 14. K:e5 de 15. Лc1 Kg6 16. Kb3 b6 17. Cd3 Ла7 18. Ka5 Ke7 19. Фе2 Ла8 20. Кc6 C:c6 21. dc Фc8 22. Cc4 Крh8 23. Лed1 f5 24. Лd7 K:c6 25. Ce6 Kd8 26. ef K:e6 27. fe c5 28. C:g5 Фe8 29. C:h6, 1:0.

Арцём Бяляўскі — Максім Царук (першынство Беларусі да 20 гадоў, 2021). 1. Kf3 Kf6 2. g3 Kc6 3. d4 d5 4. Cg2 Cf5 5. 0-0 e6 6. c4 Ce7 7. Kc3 dc 8. Ke5 0-0 9. K:c6 bc 10. Фa4 Ф:d4 11. Ce3 Фd6 12. Ф:c6 Лab8 13. Ф:c4 Л:b2 14. Лfd1 Лb4 15. Л:d6 Л:c4 16. Лc6 Л:c6 17. C:c6 a6 18. f3 e5 19. Kd5 K:d5 20. C:d5 Лb8 21. a4 Лb1+ 22. Л:b1 C:b1 23. Cd2 Cc2 24. a5 Ca4 25. Cc3 c6 26. Cc4 Cb5 27. C:b5 cb 28. C:e5 Cb4 29. Cc7 Cd2, 0:1.

* * *

Задача М. Быкава з мінулага выпуску рашаецца 1. Крe4. Першыя правільна адказалі Васіль Жуковіч, Фёдар Карпей, Ігар Ананіч, Сяргей Цяльпук, Васіль Барысевіч, Віктар Жук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**







Сядзі і глядзі

# «Я не самотны...»: акцэнты да партрэта

**На наступным тыдні 9 снежня адзначаецца 130-годдзе паэта, перакладчыка, публіцыста, класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча. Сацыякультурны тэлеканал запрашае адсвяткаваць юбілейную дату за праглядам тэматычнай перадачы.**

У дзень нараджэння паэта на «Беларусь 3» згадаюць яго ў праграме «Запіскі на палях». Дакументальны фільм «Максім Багдановіч: з дому на Радзіму» распачне аповед пра класіка айчыннай літаратуры. *«Маючы чулую і спагадлівую душу, ён міжволі прыцягваў да сябе кожнага, яго любілі і паважалі ўсе, хто яго ведаў: з ім не было весела, але было цёпла, прыемна пагаварыць і падзяліцца ўсім, што толькі ляжыць на душы. Ён быў адным з тых людзей, якія гараць, сгараючы жыццё і асвятляюць шлях іншым, але мала клапоцяцца пра сябе»*, — напісаў пра паэта ва ўспамінах Аляксандр Цітоў (газета «Голас», 1917 год). ...З парады бацькоў хлопец пайшоў вучыцца на правазнаўцу, аднак нягледзячы ні на што ўсё ж стаў паэтам. Лёс чалавека, які абраў літаратуру насуперак усім абставінам свайго жыцця. Ці паўплывалі на гэта блізкія людзі Багдановіча і чаго каштаваў яму такі выбар — адказы пашукаем разам з даследчыкамі ў 16.00.

Пасля ў эфіры ўвазе аўдыторыі прадставяць цыкл песень Уладзіміра Мулявіна на вершы Максіма Багдановіча «Вянок» (БТРК, 2018). Вядома, што прэм'ера цыкла «Вянок» адбылася ў Нью-Ёрку восенню 1991 года. А пасля праграму паказалі (9 снежня 1991 года) у Белдзяржфілармоніі, прымеркавана яна была да 100-годдзя паэта. Складаўся цыкл песень з 15 кампазіцый, сярод якіх найбольш вядомыя нам і сёння «Зорка Венера», «Вераніка», «Слуцкія ткачыхі» і іншыя.

Дакументальны фільм 1982 года «Я не самотны» зможам убачыць у 17.50. Варта адзначыць, што ў айчынным кінематографе звяртацца да даследавання асобы пісьменніка пачалі толькі ў 1981 годзе: тады з'явіўся 3-хвілінны сюжэт «Паэтычная спадчына Максіма Багдановіча», пасля — 10-хвілінны дакументальны фільм «Зорка Максіма». А вось 20-хвілінная кінастужка «Я не самотны» прадстаўляе гледачам уяўныя размовы бацькі паэта, Адама Ягоравіча, з сынам. Прычым паказваецца тое вельмі ўмоўна і ў суб'ектыўных танальнасцях. Тэкст за кадрам базіруецца на ўспамінах Багдановіча-старэйшага, якія можна знайсці ў артыкуле «Матэрыялы да біяграфіі М. А. Багдановіча» (1923 г.). Стваралі яго на творча-вытворчым аб'яднанні «Тэлефільм» Дзяржтэлерадыё БССР, рэжысёрам стаў Ігар Калоўскі. Паэта на экране ўвасабляе Сяргей Журавель, а ў ролі бацькі задзейнічаны народны артыст БССР Павел Кармунін. Адметнасцю кінаработы можна лічыць як талент аўтараў карціны, так і іх глыбокае пагружэнне ў тэму, па-майстэрску расстаўленыя акцэнты. Тут аўдыторыя мае магчымасць не проста даведацца біяграфію творцы, а менавіта пазнаёміцца з акцэнтамі ва ўзаемаадносінах двух блізкіх людзей і на аснове ўбачанага і пачутага зрабіць свае высновы.

Магчымасць паглыбіцца ў факты, погляды і акалічнасці заўсёды можна знайсці ў музеях творцы. У праекце «Музеі Беларусі» (яго пакажуць перад дакументальным фільмам «Я не самотны» ў 17.25) нам распавядуць пра музеі Максіма Багдановіча ў Гродне і Ракуцёўшчыне. *«Хоць зернейкі засохшымі былі, / Усё ж такі жыццёвая іх сіла / Збудзілася і буйна ўскаласіла / Парой вясенняй збожжа на раллі»* — гэтыя радкі мы чытаем на адной з памятных шыльдаў у Ракуцёўшчыне, дзе жыў і працаваў у 1911 годзе пісьменнік. Хочацца верыць, што і ў нас цяперашніх мастацкае слова і асоба Максіма Багдановіча абудзяць разважанні аб жыцці, аб роднай зямлі, мове і гонары за вялікіх творцаў. Такія завочныя знаёмствы з музеямі, дзе захоўваецца памяць пра нашых класікаў, вельмі часта натхняюць на рэальнае наведванне ўстаноў.

У праекце «Навіны культуры» запланаваныя інтэрв'ю з Міхаілам Бараноўскім, дырэктарам сталічнага літаратурнага музея паэта, і Барысам Ліўшыцам, дырэктарам Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча. Да юбілею Максіма Багдановіча музычны калектыў 11 снежня рыхтуе святочную вечарыну ў Белдзяржфілармоніі. Тэлеверсію канцэртнай праграмы ўбачым у хуткім часе на «Беларусь 3».

Таксама на працягу дня будуць гучаць вершы Максіма Багдановіча з цыкла «Мой Багдановіч» у выкананні вядомых асоб беларускай культуры. Знайдзіце час, каб запаволіцца і дакрануцца да сапраўднай паэзіі... *«Жывеш не вечна, чалавек, — / Перажыві ж у момант век! /... Жыві і цэльнасці шукай, / Аб шыраце духоўнай дбай»...*

**Алена ДРАПКО.**

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 1.05** Зона Х (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.40, 12.10, 18.35, 19.20 Драма «Іншыя» (16+).**
**13.05, 15.25 Драма «Слёзы на падушцы» (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**21.45** Зразумелая палітыка.
**22.00 Серыял «След» (16+).**
**0.50** Арэна.
**1.25** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 11.15, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05, 19.50** «Зразумець. Дараваць» (16+).
**10.25** «На тыдзень» (16+).
**11.45 Серыял «Стыч!» (6+)**
**12.30** «Трон эльфаў» (6+).
**14.05** «Усёй сям'ёй» (6+).
**15.00 Фільм «Фантастычная чацвёрка: уварванне сярэбранага серфера» (12+).**
**16.40** «Тры першыя спатканні» (16+).
**17.40** «Багіня шопінгу. Экстрэмальны сезон» (16+).
**18.40** «На кручку» (16+).
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**21.15 Серыял «Жаночы доктар-4» (16+).**
**22.20 Серыял «Шпік-3» (16+).**
**0.30** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.20** «Беларуская кухня».
**8.05, 12.00, 19.40, 22.30** Навіны культуры.
**8.25** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.15, 19.00** «Апошні дзень» (12+) [СЦ].
**9.50, 17.30 «Прэмія». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**11.20** «Люблю і памятаю».
**12.50** «Наперад у мінулае».
**13.20, 21.05 «Трывожная нядзеля». Маст. фільм (12+).**
**14.45** «Нічога не шкада».
**15.45 «Вясна». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**19.55** «Жывая спадчына».
**20.25** «Архітэктура Беларусі».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.50** «Маладыя таленты Беларусі». Канцэрт.

## Беларусь 5

**7.00** Азбука спорту.
**7.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Астан Віла» — «Лестэр».
**9.10** Хакей. КХЛ. ХК «Сочы» — «Дынама-Мінск».
**11.10** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
**12.40** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
**13.35** Вось гэта спорт!
**13.55** Гандбол. Кубак ЕГФ. «СКА-Мінск» (Беларусь) — «Бешыкташ» (Турцыя).
**15.35** Фактар сілы.
**16.05** Аўтаспорт. Экстрым-Е. Відэачасопіс.
**16.40** Самба. Міжнародны кубак чэмпіёнаў.
**18.50** Баскетбол. Адзіная ліга ЗГБ. «Цмокі-Мінск» — УНІКС (Казань).
**20.40** Гандбол. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Чэхія — Славакія.
**21.35** Спорт-цэнтр.
**21.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**22.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Эвертан» — «Арсенал».

## АНТ

**6.00, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16. 00, 18.00** [СЦ], **20.30, 0.45** Нашы навіны.
**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Условия аукциона и оплаты: оплата полной стоимости объекта недвижимости производится по договоренности сторон, но не позднее 15 банковских дней с момента заключения договора; после заключения договора с согласия Продавца указанный срок оплаты может быть увеличен путем подписания сторонами дополнительного соглашения к договору; право собственности на объект переходит к Покупателю только после полной оплаты и соответствующей регистрации данного права. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 21 декабря 2021 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 06.10.2021 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 17 декабря 2021 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», https://grino.by/aukcion/**

СТАЛІЧНЫ ЧАС

# ЭВАКУАЦЫЯ ПА ГРАФІКУ

**Апошнім часам мясцовыя ўлады адміністрацыйных раёнаў сталіцы складаюць графікі эвакуацыі транспартных сродкаў, якія не эксплуатуюцца, з гарадскіх вуліц, двароў і прыдамовых тэрыторый.**

У Мінску сёння налічваецца больш за 800 тысяч аўтамабіляў. Гэта вялізная лічба. І, зразумела, пэўная іх частка, хоць і даволі мізэрная, з часам сыходзіць з дарог з прычыны дарагоўлі рамонту, нявыгаднай замены запчастак, немагчымасці прайсці тэхагляд без укладання салідных сум грошай. Вось так і стаяць такія «калекі» навідавоку, нярэдка працяглы час. І што рабіць?

**Старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй БУГРОЎ** гаворыць, што рост колькасці легкавых аўтамабіляў ва ўласнасці мінчан — важны паказчык іх дабрабыту. Але, з іншага боку, кінутыя машыны — галаўны боль для мясцовай улады. Такія машыны паступова разукамплектоўваюцца зламыснікамі, стаяць са спушчанымі коламі, іржавыя і брудныя. Так бы мовіць, своеасаблівая лыжка дзёгцю ў бочцы гарадскога парадку, сапраўдны выклік добраўпарадкаваным дварам. Акрамя таго, кінутыя машыны перашкаджаюць рамонту бардзюраў, замене дарожнага палатна, а зімой — прыбіранні снегу.

Паводле слоў старшыні, змагацца за чысціню гарадскіх двароў мясцовым уладам горада дапамагаюць дэпутаты Мінгарсавета, якія ў сваіх выбарчых акругах нагадваюць мінчанам заняцца сваімі кінутымі аўтамабілямі, якія ўжо працяглы тэрмін знаходзяцца на прыколе і наўрад ці зноў будуць эксплуатавацца.

— Дэпутаты рэгулярна, прыкладна двойчы на месяц, аб'язджаюць тэрыторыю сваіх выбарчых акруг з мэтай убачыць на свае вочы, што на дадзены час робіцца на падведамаснай тэрыторыі, якія праводзяцца рамонты і г. д. Яны сустракаюцца з насельніцтвам, выслухоўваюць меркаванні жыхароў, атрымліваюць карысную інфармацыю, у тым ліку і па наяўнасці аўтахламу. І калі такія факты пацвярджаюцца, то дэпутаты даводзяць іх да адпаведных гарадскіх службаў, а тыя непасрэдна да гаспадароў кінутых машын. І такая сумесная работа дэпутацкага корпуса і мясцовай улады дае плён, — кажа Андрэй Бугроў.

Многія аўтаўласнікі пасля атрымання паведамлення аб тым, што іх транспартны сродак прызнаны непрыдатным для далейшай эксплуатацыі, імкнуцца самастойна вырашыць праблему: перавозяць машыну ў гараж ці на нейкую стаянку або ўтылізуюць. Сёлета было накіравана каля дзвюх з паловай тысяч такіх паведамленняў. Большасць аўтаўладальнікаў адгукнуліся і забралі з вуліц кінутых «жалезных коней».

Трэба адзначыць, што работа з «адпрацаванымі» аўтамабілямі ў сталіцы вядзецца ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта «Аб мерах па арганізацыі збору, захоўвання неэксплуатаваных транспартных сродкаў і іх наступнай утылізацыі». Ход спраў у дадзенай сферы рэгулярна разглядаецца на пасяджэннях рабочай групы Мінгарвыканкама па добраўпарадкаванні і ўтрыманні тэрыторый сталіцы. З пачатку гэтага года эвакуіраваны сотні аўто. Пры гэтым 250 машын уладальнікі потым забралі. А вось зусім незапатрабаваная тэхніка пасля прызнання па рашэнні суда яе безгаспадарнай утылізуецца.

Дарэчы, напярэдадні зімы члены рабочай групы абмеркавалі пытанне барацьбы са звалкамі аўтамабільнага «абутку» пасля сезоннай замены летніх шын на зімовыя ў гаражных кааператывах. Ад іх старшынь запатрабавалі захоўваць парадак.

У эвакуацыі кінутага транспарту ёсць пэўныя нюансы. Аказваецца, своечасова выявіць аўтахлам — яшчэ не значыць разабрацца з ім хутка і па правілах. На мінскіх вуліцах пакуль нямала грузавікоў і аўтобусаў, якія не эксплуатуюцца і, хутчэй за ўсё, ужо не будуць выкарыстоўвацца. Адрасы іх знаходжаня вядомыя, толькі вывезці іх не заўсёды атрымліваецца. Прычына простая: у гарадскіх службаў эвакуатары не разлічаныя на перавозку такіх габарытных машын.

Таму на сайце дзяржаб'яднання «Гаражы, аўтастаянкі і паркоўкі» размешчана запрашэнне да супрацоўніцтва юрыдычных асоб — уладальнікаў эвакуатараў (з поўнай пагрузкай транспартнага сродку) для аказання паслуг па прымусовым перамяшчэнні неэксплуатаваных аўтамабіляў.

> Змагацца за чысціню гарадскіх двароў мясцовым уладам горада дапамагаюць дэпутаты Мінгарсавета, якія ў сваіх выбарчых акругах нагадваюць мінчанам заняцца сваімі кінутымі аўтамабілямі, якія ўжо працяглы тэрмін знаходзяцца на прыколе і наўрад ці зноў будуць эксплуатавацца.

Да кантролю за ходам выканання графікаў эвакуацыі кінутага аўтатранспарту далучаюцца таксама і дэпутаты Мінскага гарадскога Савета. У такой рабоце ўсё больш актыўна ўдзельнічаюць прадстаўнікі калегіяльных органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання (КОТГСаў) сталіцы, якія супрацоўнічаюць з адміністрацыямі раёнаў і іх структурамі, напрыклад, службамі жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

**Мікалай ЛЮБЧАНСКІ.**
**Фота Рамана КЛЮЧЫНА.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

**www.zviazda.by**

**e-mail: info@zviazda.by** (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 2 снежня 2021 года.**

# У спісах жывых не значыўся

## КАЛІ МАЦІ ПРЫЯЗДЖАЛІ НА МАГІЛЫ

Варта сказаць, што аўтару гэтых радкоў за гады работы давялося наведаць шмат школьных музеяў, але такіх, дзе вядзецца паўнавартасная пошукавая работа, падтрымліваецца перапіска з нашчадкамі герояў экспазіцыі, ладзяцца з імі сустрэчы, у гэтым спісе нямнога. Цікава, што названай школе толькі 10 гадоў, а музею — больш за 40. Расказвае цяперашняя яго **захавальніца, настаўніца беларускай мовы і літаратуры Святлана КАЗАДАЕВА**:

— Музей быў створаны намаганнямі не аднаго пакалення педагогаў школы з суседняй вёскі Шылін, якую вызвалялі байцы 174-га стралковага палка. Страты полк панёс каласальныя. Толькі паводле афіцыйных даных, тут загінула больш за 600 савецкіх салдат і афіцэраў. Недзе ў 60-я гады, калі перапахавалі астанкі, паставілі помнік вызваліцелям, тагачасны дырэктар школы Іван Аляксандравіч Тур з калегамі і вучнямі сталі збіраць матэрыялы пра тыя жорсткія і страшныя баі. Тады яшчэ жылі відавочцы, сведкі падзей. Вырашылі напісаць пісьмы сваякам салдат і афіцэраў, якія засталіся ў гэтай зямлі. Адрасаты не толькі адгукаліся, яны пачалі прыязджаць з усіх канцоў былой вялікай краіны. Ёсць фотаздымкі, на якіх стаяць гаротныя маці над брацкай магілай. Вядома, кожнай хацелася пабываць там, дзе ляжыць яе сын, паплакаць на роднай магіле.

Сваякі звычайна прывозілі з сабой нейкія рэчы: дакументы, пісьмы, сувеніры. Так вось спачатку стыхійна, а потым свядома стаў фарміравацца музей. Паявіўся піянерскі пошукавы клуб «Гвардзеец». І ўжо ў пачатку 70-х гадоў сталі праводзіць вахты памяці. Ёсць нават запіс перадачы, якую ў 1972 годзе пра Шылінскую школу здымала Брэсцкае тэлебачанне, там расказвалася пра ганаровую вахту. Музей папаўняўся новымі экспанатамі, перапіска працягвалася, экспазіцыя расла. А калі школу ў вёсцы

Магільныя плиты з прозвішчамі загінулых.

закрылі, а ў Здзіташе пабудавалі новую, музейная экспазіцыя пераехала туды. Праўда, перад гэтым яна перажыла мадэрнізацыю і абнаўленне. І на новых стэндах занялі свае пачэсныя месцы партрэты герояў-вызваліцеляў. Пошукам інфармацыі пра іх спрыяе перапіска з нашчадкамі і сваякамі.

Калі раней у музей прыязджалі бацькі, жонкі байцоў, потым дзеці, то цяпер — найчасцей унукі. Яшчэ ў 2014 годзе музей наведала Марыя Мацкевіч з Украіны, тут загінуў яе бацька. Прыязджалі з Растова-на-Доне, з іншых гарадоў і сёл. Сям'я Пахомавых з Разані не проста наведвае музей, перапісваецца з яго захавальнікамі, яны аказваюць істотную спонсарскую дапамогу. Гэтая сям'я вельмі беражліва захоўвае памяць пра

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Святлана КАЗАДАЕВА дэманструе пісьмо з фронту.

свайго продка. Дома ў іх неўзабаве выйдзе кніга пра яго, асобныя раздзелы якой прысвечаныя апошняму бою, месцу гібелі і памяці, якую шануюць у беларускай вёсцы. Менавіта ўзрушаныя такой беражлівасцю, клопатам пра захаванне памяці, нядаўна яны падарылі музею сем камплектаў вопраткі для экскурсаводаў.

## ГІСТОРЫІ, ВАРТЫЯ ПРЫГОДНІЦКАГА РАМАНА

Раней адзінай крыніцай звестак служыла перапіска, цяпер дапамагае інтэрнэт. З'явіліся адмысловыя сайты, на якіх можна праверыць асобныя звесткі альбо нават знайсці новыя, звязацца са сваякамі. Менавіта праз інтэрнэт адгукнуўся сын Дзмітрыя Андрыянава, імя якога выбіта на адной з пліт брацкай магілы. І агаломшыў паведамленнем: бацька не загінуў у тым баі, быў паранены, трапіў у палон, потым уцёк, дайшоў амаль да Берліна, а памёр толькі ў 2002 годзе.

Гісторыя масквіча ў першым пакаленні Дзмітрыя Андрыянава тыповая і нетыповая адначасова — на вайне, куды ён трапіў 22-гадовым юнаком, усялякае бывала. І парознаму выжывалі тыя, каму пашанцавала выжыць. Пра яго ваенныя дарогі можна, відаць, напісаць кнігу альбо зняць прыгодніцкі фільм. Сям'я хлопца з разанскай вёскі пераехала ў Маскву ў пачатку 30-х гадоў. Міця добра вучыўся і пасля школы паступіў у аўтадарожны інстытут. ВНУ на той час адносілася да НКУС, адкуль перыядычна папаўнялі састаў ваенных навучальных устаноў. І пасля другога курса юнака пераводзяць у Ленінградскае вышэйшае ваенна-марское вучылішча. Ён скончыў названае вучылішча ў верасні 1941 года і быў накіраваны на Чарнаморскі флот, гэта значыць, на вайну. Юны лейтэнант стаў камандзірам разведвальнага ўзводу адной з брыгад марской пяхоты. Яны абаранялі Севастопаль, білі ся да апошняга, але іх часці былі ўшчэнт разбітыя. З акружэння выбіраліся дробнымі групкамі. Так і ён з рэштках ўзводу пасля доўгіх бадзянняў аказаўся ў Запарожскай вобласці недалёка ад горада Марыупаля на акупаванай тэрыторыі. Там працягваў функцыянаваць буйны калгас, акупанты выкарыстоўвалі яго для забеспячэння правіянтам сваіх войскаў. Мясцовыя жыхары падказалі хлопцам, што яны могуць выдаць сябе за жыхароў суседніх сёл і ўладкавацца на работу. Так і зрабілі маракі. І працавалі да лістапада 1943 года, пакуль тэрыторыю не вызвалілі ад фашыстаў.

Дзмітрый Андрыянаў і яго таварышы прайшлі праверку ў падраздзяленні СМЕРШ, пасля чаго лейтэнант быў накіраваны камандзірам узвода ў стралковы полк адной з дывізій 3-га Украінскага фронту. У адным з першых баёў атрымаў цяжкае раненне ў галаву, лячыўся чатыры месяцы. Са шпіталя, які знаходзіўся ў Грузіі, атрымаў накіраванне да новага месца службы. На адной з вузлавых станцый, дзе лейтэнант павінен быў зрабіць перасадку, ён сеў не ў свой цягнік, а ў іншы, у той, што ішоў у Маскву... Ён столькі гадоў не бачыў родных. Разлічыў, што зможа заскочыць да сваіх на дзень, а потым паспець да новага месца службы. Сваіх ён убачыў, але быў затрыманы ваенным патрулём, зноў праверкі, зноў новае прызначэнне. Так лейтэнант Андрыянаў трапіў ужо на 1-ы Беларускі фронт і стаў удзельнікам аперацыі «Багацыён».

## БАІ ЗА ШЫЛІН, ПАХАВАНКА, ШТРАФБАТ

У складзе 174-га стралковага палка 20-й стралковай дывізіі камандзір узвода са сваімі байцамі біліся за вёску Шылін. З успамінаў Дзмітрыя Андрыянава, апублікаваных яго сынам: *«Бой быў сапраўдным кашмарам нават для бывалых байцоў. Наступаць на пасёлак Шылін давялося пасля невялікага адпачынку проста з маршу. Не было дакладных разведданых пра абарончыя пазіцыі праціўніка, не было і надзейнай сувязі паміж падраздзяленнямі палка. Артылерыя палка адставала, таму не было неабходнай агнявой падтрымкі. Камандзір 20-й дывізіі загадаў наступаць праз балота. Акапацца на балоцістай мясцовасці немагчыма. Наступалі цэлым палком у лінію рот, такім чынам, байцы аказваліся непрыкрытай мішэнню для праціўніка. Толькі пасля сёмай няўдалай контратакі паступіў загад на адступленне»*.

Шылін вызваляць пазней, калі падыдзе артылерыя. А ў тых баях іх загінула вельмі многа, Андрыянаў быў паранены ў плячо асколкам снарада і разам з іншымі байцамі захоплены ў палон. У дакументах жа ён значыўся як забіты ў баі 14 лістапада 1944 года. Сям'я атрымала пахаванку.

Спачатку знаходзіўся ў брэсцкім лагеры для ваеннапалонных, а калі лагер этапіравалі ў Варшаву, ужо на тэрыторыі Польшчы з групкай байцоў яму ўдалося ўцячы. Потым дабраліся да сваіх, зноў праверка па лініі СМЕРШ і новае прызначэнне на фронт. Ваяваў на Усходняй Прусіі, але неўзабаве быў накіраваны на новую праверку ў фільтрацыйны лагер і аказаўся ў штрафбаце, яму прыпомнілі палон ды іншыя эпізоды ваеннай біяграфіі. Там Андрыянаву пашанцавала выжыць, і пасля месяца баёў у складзе новага падраздзялення, 11 мая 1945 года ён быў накіраваны ў звычайную часць, з вайны вярнуўся ў лістападзе 1945 года.

## «ЖЫЦЦЁ ДЗЁШАВА НЕ АДДАДЗІМ!»

Сын франтавіка, Уладзімір Андрыянаў, доктар эканамічных навук, прафесар, які доўгі час працаваў у апараце Урада Расійскай Федэрацыі, пазней дырэктарам Дэпартамента стратэгічнага аналізу і распрацовак дзяржкарпарацыі Знешэканомбанка, вельмі ўдзячны школе за беражлівае стаўленне да памяці пра 174-ы полк. Уладзімір Дмітрыевіч абяцаў прыехаць сёлета, каб пакласці праху аднапалчан бацькі і паглядзець на пліту, дзе значыцца імя роднага чалавека ў ліку загінулых у 44-м.

Пастаянна трымае сувязь з музеем Уладзімір Піскоў з Брэста. Тут знайшоў спачын яго сваяк, ураджэнец Тбілісі Філіп Садоўскі. Сёлета, упершыню за доўгія гады, з-за пандэміі не праводзілі вахту памяці да Дня Перамогі. Але Уладзімір Васільевіч з жонкай, дзецьмі, унукамі ўсё роўна прыехалі, каб пакласці магіле сваяка, пабыць у музеі. Яны прыязджаюць сюды кожны год, і на гэты раз прывезлі новыя здымкі іх франтавіка, новыя звесткі, якія ўдалося ўстанавіць за апошні час.

Бясцэнным экспанатам экспазіцыі з'яўляецца пісьмо з фронту Васіля Мацвеевіча Пахомава. Ён пісаў свой ліст да родных 12 ліпеня. Там ёсць радкі: «Заўтра ў нас бой. Як скончыцца, не ведаю. Але жыццё дзёшава не аддадзім». Ён вытрымаў шэсць цяжкіх контратак, а ў сёмай загінуў. У кішэні яго гімнасцёркі знайшлі здымак сям'і, па краях фотакартка была ў крыві.

Нашчадкі часта прыязджалі ў музей. Яшчэ тады, калі экспазіцыя знаходзілася ў Шылінскай школе. Яны дапамаглі сродкамі на мадэрнізацыю музея, яны і перадалі сюды дарагую сямейную рэліквію — пісьмо свайго дзядулі.

— Экспанаты ёсць розныя, — паказвае Святлана Казадаева. — Напрыклад, пашпарт часоў акупацыі, выдадзены жыхарцы вёскі Вугляны. Дакумент з фотакарткай, захавалася прозвішча, імя ўладальніцы. Орган, які выдаў паперу, названы генеральным губернатарствам. А знайшлі яго на... сметніку. Іншыя рэчы знаходзілі ў полі, на месцы баёў. Тут і кубкі, зробленыя з гільзаў снарадаў, фрагменты зброі, абмундзіравання. «Мой муж вырас у Шыліне, — гаворыць Святлана Мікалаеўна. — У кожнага з хлопцаў яго пакалення былі прыхаваныя часткі




Схема баёў за Шылін.

ад аўтаматаў, штык-нажоў, іншыя рэчы. Пазней, калі выраслі, яны ўсё гэта прынеслі ў музей».

— Цяпер у рабоце мы выкарыстоўваем новыя тэхналогіі: у нас ёсць шмат відэаматэрыялаў, напрыклад запіс рэканструкцыі бою, выкарыстоўваюцца QR-коды пры азнаямленні з экспазіцыяй, — гаворыць **дырэктар школы Святлана ШУМОВІЧ**. — Але галоўнае — гэта жывыя нітачкі сувязі са сваякамі, перапіска, сустрэчы, якія напаўняюць зместам наш музей. Нашы вучні самі праводзяць экскурсіі, пішуць даследчыцкія работы пад кіраўніцтвам Святланы Мікалаеўны. Яны па-сапраўднаму цікавяцца гісторыяй. Мы праводзім таксама сустрэчы з выпускнікамі, воінамі-афганцамі, якія заўсёды атрымліваюцца кранальнымі, душэўнымі мерапрыемствамі. Усё гэта гадамі па крупінках засвойваецца вучнямі нават на ўзроўні падсвядомасці і становіцца тым падмуркам, які складае аснову патрыятычнага выхавання.

Кожны год на месцы пахавання байцоў 174-га палка праводзіцца вахта памяці. І кожны год адкрываюцца новыя імёны. Калі два гады таму гэтых імён было 200, то цяпер 205. У музеі баявой славы названага палка пошук працягваецца.

**Святлана ЯСКЕВІЧ, фота аўтара.**

*Бярозаўскі раён.*

# Галубіная, Чорная, Таемная...

## Выдуманыя кнігі ў творах беларускіх пісьменнікаў

*«І праходзіў Падарожнік, які ведаў усё, і прайшоў паўсюль і чытаў усе кнігі, нават Галубіную, што ўпала з неба».*

Так піша Уладзімір Караткевіч у паданні пра князя Слуцкага і яго замак на Князь-возеры.

У Галубіную кнігу, дзе можна знайсці адказы на ўсе пытанні, верылі тысячы гадоў... Зрэшты, як сёння для нас цалкам рэальныя раман пра Понція Пілата, напісаны булгакаўскім Майстрам, «Даведнік па Галактыцы для аўтастопшчыкаў», прыдуманы Дугласам Адамсам, «Казкі барда Бігля» з сусвету Гары Потэра і «Некраномікон» ад Лаўкрафта.

Кніга — магутны артэфакт для кожнага літаратара... Таму нярэдка робіцца рухавіком сюжэта, а яшчэ — аб'ектам містыфікацыі ці зашыфраваным намёкам. Франсуа Рабле ў неіснуючую бібліятэку Сен-Віктарскага абацтва змясціў кнігі з парадыйнымі назвамі, высмеяўшы нелюбімых схаластаў. Цэлыя бібліятэкі прыдумалі Умбэрта Эка і Борхес. Станіслаў Лем склаў зборнік «Абсалютная пустэча» з рэцэнзій на неіснуючыя кнігі. А мы давайце складзём ну калі не бібліятэку — дык хаця б паліцу з кніг, народжаных фантазіяй беларускіх пісьменнікаў.

### Чорная кніга Твардоўскага

І пачнём з самага містычнага беларускага літаратара, а менавіта Яна Баршчэўскага. У яго творах звычныя героі — алхімікі ды чарнакніжнікі... Самы магутны з іх — пан Твардоўскі, які воляю аўтара выкладае ў Полацкім езуіцкім калегіуме. У пана Твардоўскага з'явіўся любімы вучань, шкаляр Гугон. Аднойчы ўвечары, калі настаўніка не было дома, Гугон пабачыў, што Твардоўскі пакінуў у замку свайго пакоя ключ. Ну і не стрымаў цікаўнасці...

*«Уваходзіць у пакой, на стале бачыць велізарную кнігу ў старасвецкім пераплёце з пергамену; глянуўшы ў яе, ён здзівіўся, бо першы раз у жыцці сустрэў белы друк на чорнай паперы, і ледзь прачытаў паўстаронкі, з'явіўся перад ім цераваты каруэлік, вочы свяціліся белым агнём, твар чорны, як вугаль».*

Як вядома, цікаўнасць падлягае пакаранню. Выкліканы выпадкова дух забіў Гугона, а потым яшчэ па просьбе Твардоўскага ўсяліўся ў цела ахвяры. Не чапайце Чорную кнігу, нават калі яе гаспадара побач няма!

### Сабранне навук Зямельчыца

Вацлаў Ластоўскі, інтэлектуал і містык, у апавесці «Лабірынт» таксама стварыў цэлую бібліятэку ўнікальных выданняў. Герой кнігі знаёміцца з дзіўным старым па мянушцы Падземнік, які з'яўляецца ахоўнікам бібліятэкі полацкіх сутарэнняў. Падземнік, якога завуць Іван Іванавіч, абірае героя сваім пераемнікам і праводзіць у таемную полацкую бібліятэку. Там шмат залаў, *«аграмадныя фаліянты, пісаныя на пергаміне і шоўкавых тканінах, залягалі ўсе сцены: унізе, каля сцен, у дубовых, абіваных сярэбранай бляхай скрынях разложаны былі звіткі, пісаныя на розных мовах»*. Ёсць цэлы аддзел кніг, пісаных забытай глаголіцай. Сярод іншага герой *«убачыў сабранне навукі Зямельчыца, якое складалася з чатырох кніг, разбітых кожная на семдзесят два раздзелы. На змест кнігі злажыліся: маральнае права, цывільнае і дзяржаўнае права, гісторыя народа і анталогія лепшых тагачасных літаратурных твораў»*.

Каб дадаць праўдападобнасці, Ластоўскі дае даведку нібыта ад выдавецтва пра таго Зямельчыца, спасылаючыся на антычныя крыніцы. Зямельчыц — гетскі мудрэц, які жыў раней за Піфагора. Сапраўды, ёсць такі персанаж, Zamolxis, старажытныя геты ўважалі яго за Бога. Але згаданага збору твораў ад яго, вядома, не засталося.

### Падручнік, як гаварыць мала і важка, і паэмы Пушкінзона

Андрэй Мрый у «Запісках Самсона Самасуя» кіраваўся метадамі Рабле. Немагчыма без смеху чытаць, як малады невукар'ерыст, ад'язджаючы да месца новага прызначэння, бярэ з сабою самае неабходнае:

*«Чатыры кніжкі я лічыў настольнымі і ніколі з імі не разлучаўся:*

*1) падручнік, як гаварыць мала і важка,*

*2) культура трох камераў цела,*

*3) як размяркоўваць свае функцыі і*

*4) падручнік па агульнаму кіраванню».*

У вёсцы Шапялёўка, дзе Самсон Самасуй займаецца «ажыўленнем культпрацы», у яго з'яўляецца паплечнік — загадчык нардому, пясняр Гарачы з сапраўдным прозвішчам Пушкінзон. Мрый хвацка парадзіруе сучаснікаў, захопленых пафаснай рыфмаванкай. Пушкінзон, ён жа Гарачы, *«Сялянам на сходах... чытаў сваю паэму «За тваім гарбатым носам нічога не бачу». Ён сапраўды стаўся тварам да вёскі. Вечарамі кандыбоберам хадзіў з дзяўчатамі па вуліцы, на ўсе грудзі цягнуў вясковыя прыпеўкі і, каб высока ўзняць сцяг паэзіі, сам новыя прыпеўкі прыдумаў. Яны вельмі спадабаліся на вёсцы. Некаторыя і мне ўлезлі ў галаву:*

*Галіфэ маё худое*
*Разарву я да кален.*
*Думаў з восені*
*жаніцца —*
*Маўчыць дзевачка,*
*як пень.*

*Каля нашага ваконца*
*Прашкандыбала цяля,*
*Я за хвосцік ухапіла —*
*Думала маё міля!»*

Пясняр Гарачы — таварыш пладавіты:

*«Ля рэчкі ім напісана славутая паэма «Дні мае крутыя». Шкода толькі, што ў мяне цяжкая памяць на вершы, а між тым у паэме ёсць месцы, хвалюючыя да стогнаў фізіялагічных. Там былі радкі, якія да вар'яцтва падабаліся ўсім. Нешта:*

*Ў 17 годзе парвалі*
*мне радасці цуглі.*
*Дротам калючым*
*пралезлі ў грудзі.*
*Сціснулі торбу*
*сардэчную*
*Вяроўкаю помсты».*

А вось як суцяшае Самасуй супрацоўніцу: *«Цяпер, тав. Надзея, не верце мужчыне, хоць ён клянецца, хоць ком зямлі глынець з яйцо, як перасцерагае ўсіх жанчын пясняр Гарачы ў сваёй паэме «Кроў і зялеза»*.

Ёсць у аповесці Мрыя і свае «Чорныя кнігі»: настаўнік Мамон просіць у Самасуя садзейнічання ў канфіскацыі *«у гр. Андрэя Выбейдуха старалатынскай кнігі, па якой ён займаецца чорнай магіяй і наводзіць цень на ўсіх добрых людзей, у гр. Багдана Злыбядухі рукапіснай кнігі, па якой ён лечыць жывёлу і людзей ад мэханічнай хваробы трасцы»*. А ў «Шапялёўскім дзяржаўным музэі імя тав. Андросава», створаным па ініцыятыве Самасуя, экспануюцца *«цікавы рукапіс XV стагоддзя «Аб гаспадарчым выхаванні жывёлы», дзённік абжэрства (XVI ст.) і зборнік вершаў XVII ст. — «Ён і яна»*. Апошні экспанат — парадыйная загадка пра паэму Янкі Купалы «Яна і я», якую маладыя паэты лічылі састарэлай.

Дарэчы, сам Самсон Самасуй — аўтар п'есы «Пратарчака жыцця», напісанай ім для Шапялёўскага самадзейнага тэатра, а таксама трох трактатаў, у тым ліку пра шапялёўскага Трагладыта.

### Кніга князёў Альшанскіх

Вялікім кніжнікам быў Уладзімір Караткевіч, і нядзіўна, што сюжэт яго рамана «Чорны замак Альшанскі» пабудаваны вакол кнігі. Яе перадае герою, гісторыку Антону Касмічу, сябар Мар'ян Пташынскі. З-за гэтага артэфакта Пташынскі будзе забіты, а Касміч адшукае схаваны ў кнізе ключ да скарбаў злавеснага князя Альшанскага.

*«Тры кнігі памерам у аркуш, узятыя ў адзін пераплёт з рудой скуры канца XVI стагоддзя. Ні густу, анічога. А кнігі, сапраўды, дужа каштоўныя, толькі які ёлуп іх сабраў пад адной вокладкай: «Евангелле» 1539 года, выдадзенае накладам князя Юр'я Сямёнавіча Слуцкага, ды тут жа «Евангелле» Цяпінскага, ды да яго прышмараваны «Статут» 1580 года выдання, той, што пад дагляд ам Льва Сапегі рабіўся»*.

Кнігі названыя рэальныя, хоць, зразумела, пад адной вокладкай, ды яшчэ са схаваным таемным пасланнем іх не існуе. А Караткевіч яшчэ надзяляў сакавітымі дэталямі:

*«Евангелле» Цяпінскага было надзвычай рэдкім экземплярам. З набору былі выцягнуты «літаркі», каб засталося пустое месца.*

*Ясна, друк у Цяпінскага быў не той, што ў Скарыны. Бедны друк дужа беднага друкара. І нейкаму багатаму чалавеку гэта не спадабалася. І ён папрасіў аб адной такой кнізе, толькі без «літарак», для сябе. А на пустых месцах папрасіў нейкага мініяцюрыста намаляваць тыя літаркі фарбамі і золатам. Каб кніга выглядала на больш багатую. І мастак гэта зрабіў. З густам і ўмельствам»*.

### Двухтомнік фальклору робатаў

У фантастычным рамане Леаніда Дайнекі «Чалавек з брыльянтавым сэрцам» дзеянне адбываецца ў далёкай будучыні, дзе людзі суіснуюць з цывілізацыяй робатаў, з якой, зразумела, адносіны складваліся няпроста. Напрыклад, былі паўстанні робатаў — кіраўнік аднаго з іх, *«робат Х-29342 назваў сябе Спартаком і загадаў усіх інжынераў і тэхнікаў, што апынуліся ў руках паўстанцаў, распяць на металічных крыжах. Ледзьве ўдалося пранікнуць у лагер мяцежнікаў і абясточыць усіх»*. Галоўны герой рамана — «прафесійны гісторык Гай Дубровіч». Да Гая прыязджаюць сябры.

*«Усе госці таксама ўлягліся спаць. Толькі было чутно, як Дулеб хадзіў унізе, у камінной зале, чыгуннай рыдлёвачкай выграбаў попел, дзынкаў дужкай вядра, а потым нават ціхенька заспяваў куплет з «Танга робатаў»:*

*Там, дзе за горадам жаўцеюць горы металалому,*
*Дзе ў іржавым падшыпніку зацвіў сіні васілёк,*
*Я сустрэну цябе. І мы прагонім сум і стому.*
*І я навекі запомню твой крылата-спружынны крок.*

*«Добрая песня, — падумаў, ужо амаль засынаючы, Гай. — Простая даходлівая мелодыя, чыстае пачуццё. Кажуць, у кнігарнях з'явіўся двухтомнік фальклору робатаў. Трэба купіць»*.

### Таямнічая кніга Разанава

Паэт Алесь Разанаў, які, на жаль, нядаўна сышоў з жыцця, быў майстрам алюзій ды гульні ў сэнсы. У яго вершы-версэце «Вучань чараўніка» мы ўбачым адсылкі і да апавядання «Твардоўскі і вучань» са «Шляхціца Завальні», і да Гётэўскага «Фаўста».

*«Не ўтрываўшы, я адгарнуў наступную старонку...*

*«Ліхнаэль, Весмалон, Гермашур, Мэмрагай...» — я чытаю, спяшаючыся, няўцямныя словы-імёны той старой таямнічай кнігі, якую на часіну даверыў мне мой настаўнік...*

*А на дварэ раптам цямнее, як пры змярканні. Чароды птушак запалоньваюць двор і з гучным пранізлівым крыкам абрушваюцца ў дзверы і вокны.*

*Спалатнелы, я не паспяваю што-небудзь зрабіць, куды-небудзь падзецца, як у хату ўбягае ўгневаны чараўнік, выхоплівае кнігу, шэпча...*

*Ужо не вучань, я ўсё далей адыходжу ад чараўніковай сядзібы.*

*Аднак словы, тыя забароненыя словы імёны, якія я вычытаў у кнізе... —*

*я мучуся, я намагаюся не ўспамінаць іх, не дапусціць іх да свайго розуму, не застацца з імі сам-насам...*

*Я баюся таго, што ведаю.*

*За вокнамі маёй свядомасці цёмныя крыкі».*

* * *

Што ж, спадзяюся, што з гэтай віртуальнай паліцы вы здымеце разам з уяўнымі і рэальна існуючыя кнігі беларускіх пісьменнікаў. Прыемнага чытання на роднай мове!

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# ВЯСЁЛАЙ БЫЛА НАША ХАТА

Як часам піша «Звязда», «што было — было». Неяк раз, 9 мая, у нашай вясковай хаце гасцяваў сапраўдны генерал, і мая непітушчая мама з ім выпіла.

Зрэшты, расказ аб гэтым трэба пачаць здалёк.

Кажуць, старажытныя мудрацы не прызнавалі дарог, якія не вялі да храмаў. Іх, цэрквяў, касцёлаў, сінагог, мячэцяў, трэба разумець, вельмі многа было, і ў нас, у Беларусі — таксама, але ж некалі даўно, бо потым шмат што было разбурана, шмат што зачынена. Людзі сталі хадзіць іншымі сцежкамі — хто на розныя кінафільмы, канцэрты ды танцы, хто (не без гэтага) у краму па віно, а хто і да нас у хату ці на падворак.

Я раскажу, чаму. Таму што жылі, можна сказаць, у цэнтры, у самым бойкім месцы. З аднаго боку ў нас быў будынак Дома культуры з танц- і кіназалам на 360 месцаў, з бібліятэкай, з канторай гаспадаркі, з другога — ФАП. Вось людзі і сцякаліся. Нейкага спецыяліста на месцы няма, дакторка на выкліку, зарплату яшчэ не прывезлі ці па яе забралася вялікая чарга, — значыць, у нас можна пачакаць, абмеркаваць апошнія навіны, з нечага ці з некага пасмяяцца... Прычым не толькі: у дзень той жа зарплаты, напрыклад, убачыўшы збор публікі, у нас на падворку з'яўляўся мясцовы тэнар, дзядзька Міша, — спяваў свае каронныя «Вдоль по Питерской» і «Коробушку»... Голас быў — не перадаць! Па такім вялікая сцэна плакала!

Не пуставаў і наш Дом культуры. На тыя ж індыйскія фільмы народ проста валам валіў (часам, дарэчы, праз наш двор, бо так на дваццаць метраў бліжэй) і са сваімі табурэткамі, бо крэслаў (паўтаруся: 360!) не хапала... Калі ж прывозілі кіно «толькі для даросłых» (цяпер гэта 16+), тыя ў нас пакідалі дзяцей, а самі ішлі глядзець...

І ўсім было добра: мы, малыя, гулялі альбо, седзячы на ганку, глядзелі на экран, слухалі індыйскія песні.

З ліхвой хапала і сваіх: у нас быў свой вакальна-інструментальны ансамбль, на танцы сцякалася моладзь з усёй акругі. Здаралася, месца для ўсіх не хапала, і тады частка моладзі выходзіла на двор, на свежае паветра. Часам сярод кавалераў разгараліся спрэчкі і — зноў жа не без таго — трашчалі штыкеціны нашага плота.

З канцэртамі, са спектаклямі выступалі ў нас і сапраўдныя артысты — з Масквы, з Кіева, а неяк быў цырк з Ленінграда... І тады калі-нікалі начальства прасіла маму па-суседску зварыць бульбачкі, прынесці салёных агурочкаў альбо і ў нас дома сабраць на стол — пачаставаць некага з самых пачэсных прыезджых гасцей.

...Прыкладна так у нашай хаце з'явіўся сапраўдны генерал, і частавалі яго таксама ўсім сапраўдным: цікавай гутаркай (бацька мог падтрымаць размову хоць з першакласнікам, хоць з міністрам), гарачай бульбай, салам, агуркамі, мёдам...

Здаецца, усяго ўжо хапала на стале, аднак мама ўсё тупала, старалася нешта падаць. І тады генерал проста загадаў ёй сесці, наліў віна. Ніякія маміны адгаворкі ў разлік не браліся (дзень Перамогі!), — прыйшлося ўважыць кампанію, выпіць. Потым яшчэ і яшчэ...

Калі госці з хаты сышлі, мама ляжала, як тая параненая — з мокрым ручніком на галаве. А тата потым падсмейваўся: маўляў, ага, яна непітушчая з законным мужам, а як з генералам, дык ого-го!

...І яшчэ. Хата наша будавалася па тыпавым праекце. Акурат такіх самых, абсалютна аднолькавых, у вёсцы, на вуліцы, было шмат. Не дзіва, што часам п'яныя дзядзькі (цёткі напіваліся хіба з генераламі) блыталі весніцы, а потым і дзверы. Такім чынам у нас ледзь не паўтарылася вядомая кінагісторыя: пакуль мама тупала па гаспадарцы, у хату «ўваліўся» адзін з суседзяў, раздзеўся і лёг у пасцель...

Можна ўявіць пачуцці бацькі, які, вярнуўшыся з работы, убачыў, што ягонае месца ўжо занятае...

Шчасце, чалавек той быў і добра знаёмы, і сам па сабе прыстойны... Проста з вяселля ішоў, «стаміўся» і трохі «недацягнуў»: яго дом — такі самы цагляны, абтынкаваны — быў на нашай жа вуліцы, метраў на дваццаць далей... Назаўтра прыходзіў выбачацца.

...Карацей, вёска тады жыла весела. Цяпер — класік праўду пісаў — «Няма таго, што раньш было».

**Іван Гаральчук,**

*г. Мінск.*

# З ВАЎКАМІ ЖЫЦЬ...

Не ведаю, як чый, — наш хатні тэлефон у апошнія гады амаль заўсёды маўчыць. Гэта некалі ён не сціхаў, асабліва па вечарах, бо служыў і нам, і суседзям... У многіх тады свайго не было. Бывала, просяць «да апарата» Ларысу Іванаўну (помніце ў «Міміно»?), і пакуль ты сцяміш, якую?.. Здаралася, не толькі на іншы паверх, у суседні пад'езд па яе хадзілі. Вось так і знаёміліся, калі было з кім, бо часам жа людзі не туды траплялі, памыляліся...

У адну кватэру, як расказвалі, нехта цэлы дзень званіў — прасіў да тэлефона Васіля Іванавіча. Казалі чалавеку, што не тыя лічбы набраў, што тут такога няма. Ён як быццам верыў, нават прабачаўся, а праз нейкі час зноў абрываў тэлефон... Дастаў, карацей: прыйшлося сказаць, што Васіля Іванавіча няма і не будзе, што ён... патануў. «Як? — жахнуўся суразмоўнік. — Калі гэта здарылася?!» — «Даўно... Яшчэ ў Грамадзянскую...»

Больш па тым нумары Васіля Іванавіча не пыталіся, бо нарэшце зразумеў чалавек, што не трэба шукаць «нябожчыка» там, дзе яго няма. Зразумеў, заўважце, з дапамогай жарту — у гэтым выпадку, магчыма, абдуманага. А бывае ж...

Восем гадоў таму, якраз перад Калядамі, нашаму зяцю спаўнялася 30. Мы доўга думалі, што б яму падарыць, і ўрэшце палажылі ў канверт грошы на новы мабільнік.

Ледзь не назаўтра Сяргей пазваніў нам (ужо з новага тэлефона), падзякаваў за падарунак, сказаў, што вывучае яго магчымасці...

Гэта — я добра помню — было ў нядзелю, а ў панядзелак...

Раніцай, на трамваі, зяць паехаў на работу. Па дарозе, як потым расказваў, зайшоў у інтэрнэт, паглядзеў-пачытаў навіны — не заўважыў, як дабраўся да свайго прыпынку... Спешна рушыў на выхад, выключыў тэлефон, які раптам на ўвесь трамвай аб'явіў: «Слухайце казку «Воўк і сямёра казлянят».

Шчасце, што дзверы ў трамваі ўжо адчыніліся, і Сяргей — разам з усімі «казлянятамі» — паспеў выскачыць на вуліцу. А ўжо там — збочыў у двор найбліжэйшага дома, хай не адразу, але ж выключыў казку, пабег на работу і нават паспеў на ранішнюю планёрку. Сяргеева начальства праводзіла іх кожны панядзелак (гэта — як закон) і называла пяцімінуткамі, хоць цягнуліся яны... У асобныя дні — проста гадзінамі! За гэты час, як казаў Сяргей, можна было б чорту галаву скруціць, а яны замест гэтага сядзелі за сталом: слухалі выступленні, нараканні, папрокі шэфа, потым з пустога ў парожняе пералівалі самі.

Мабільнікі перад нарадай, ну вядома ж, выключалі. Сяргей, як быццам, таксама, але ў той раз — новы апарат! — мусіць, неяк не так. Факт, што словы дырэктара: «Сёння я забраў вас, каб сказаць...», перапыніла гучнае: «Слухайце казку «Воўк і сямёра казлянят»...

Шасцёра ўдзельнікаў нарады (Сяргей — сёмы — разам з тэлефонам куляй сігануў за дзверы) ледзьве стрымалі рогат!

...Факт, што пяцімінутка ў той панядзелак прайшла ўсяго за паўгадзіны. І потым, у іншыя панядзелкі, больш чым 30 хвілін яны не займалі — людзі ішлі працаваць. Праўда, без нашага зяця: ён на ўсякі выпадак звольніўся — знайшоў сабе іншую работу.

**Ірына Нічыпарчук,**

*г. Гродна.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

Неасабісты суб'ектыў

# Вера, надзея і любоў

## Як ні банальна гэта гучыць, менавіта на іх нярэдка ўсё і трымаецца

ВОСЬ такой слатой у вечным паўзмроку, якая толькі на пачатку снежня і бывае (далей будзе весялей — Новы год хутка, снегу больш насыпле, а пасля і дзень пакрысе большаць пачне) хочацца чагосьці вельмі добрага, праўда? Нейкай такой гісторыі, хай сабе і з кнігі або з фільма, а яшчэ больш — сапраўднай, нявыдуманай, ад якой і на душы пацяплее, і людзі ў тваіх вачах як від жывых істот палепшаюць, і ты, паколькі да гэтага віду адносішся, пра сябе самога лепш думаць пачнеш... Менавіта такая гісторыя ўжо паўгода «жыве» і развіваецца ў маім смартфоне, дакладней, у «Вайберы», у групе з красамоўнай назвай «Малыш, жыві!». Зрэшты, гісторыя не зусім пра Малыша...

ХОЦЬ менавіта з яго, прынамсі для большасці з гэтай групы, усё пачыналася. Памятаеце, я ўвесну пісала пра сабаку, якога ў Старобіне закапалі жывым, як добрыя людзі яго праз пяць дзён дасталі з зямлі, як адна добрая жанчына не дала яго ўсыпіць, а павезла ў Мінск ратаваць. Як падключыліся іншыя добрыя людзі, як стварылі сваю супольку, як скідваліся Малышу (так назвалі выратаванага сабачку) на лячэнне і рэабілітацыю. Як Малыш пачаў зноў бачыць, а пасля і шавяліць заднімі лапамі, як усе мы радаваліся: выратавалі жывую душу! Пра гэта перад Вялікаднем паказалі сюжэт на тэлебачанні, і, здавалася, усё ідзе да хэпі-энду: Малыш хутка папраўдзіцца і яму — з яго вядомасцю — абавязкова знойдуць клапатлівага добрага гаспадара...

Але ўсё аказалася не так проста і весела. Ішоў час, нягледзячы на рэабілітацыю з усёмагчымай фізіятэрапіяй і меркаваннем урачоў, якія гаварылі, што пазваночнік у сабакі не пашкоджаны, Малыш так і не стаў на заднія лапы. Назначылі дадатковае даследаванне — і атрымалі несуцяшальны дыягназ: дэгенератыўная мielапатыя. Калі не ўдавацца ў падрабязнасці — даволі рэдкае генетычнае захворванне, пры якім у жывёлы паступова адмаўляюць канечнасці, урэшце яна не можа рухацца ўвогуле і гіне. Хутчэй за ўсё, калі Малыш перастаў станавіцца на заднія лапы, яго «гуманныя» гаспадары (якіх, дарэчы, нібыта шукалі, каб прыцягнуць да адказнасці, але так і не знайшлі) вырашылі яго забіць, «каб не мучаўся». Стукнулі па галаве і прывезлі на пустку закопваць. Але не дабілі, і няшчасная жывёла стагнала пад зямлёй, пакуль людзі не пачулі і не выцягнулі яе з таго свету...

КАРАЦЕЙ, ахвотных узяць сабаку-інваліда з такім дыягназам (ды яшчэ самага што ні ёсць тыповага дварняка) без перспектывы, што паправіцца, не знайшлося. Гатовыя былі дапамагаць добрым словам (на гэта ўвогуле ўсе шчодрыя), грашыма (такіх ужо значна менш), хтосьці ўвогуле пакінуў групу, каб не мець дачынення да гэтай ужо не такой добрай і пазітыўнай гісторыі. Але ніхто не сказаў: «Я вазьму». Сабака заставаўся ў цэнтры рэабілітацыі, знаходжанне ў якім зусім нятаннае. Чым бы ўсё скончылася, калі б перастала хапаць сабраных на гэта грошай, — уяўляць не хацелася. А яшчэ вось у мяне асабіста ўсякія паскудныя думкі пра мяне саму лезлі ў галаву. Шкада, канешне, сабачку да слёз, і я ўзяла б яго... Калі б кватэра была большая, работа з іншым графікам, калі б кошкі не было... Дый увогуле — чаму павінна менавіта я? Вунь у групе больш за паўтысячы чалавек — знойдзецца ж нехта. Падазраю, што тыя самыя больш за паўтысячы думалі прыблізна тое ж.

АКРАМЯ адной жанчыны. Той самай, якая прынеслася ў Старобін і забрала паўжывую жывёлу, не дазволіўшы яе ўсыпіць. Якая на сваёй машыне вазіла Малыша ў Мінск. Урэшце Малыш з усімі свамі болькамі і несуцяшальным дыягназам пасяліўся ў яе кватэры ў Салігорску. І цяпер яна носіцца з ім — літаральна, бо даволі цяжкага сабаку на вуліцу трэба выносіць на руках. Не кажучы ўжо пра догляд жывёлы-інваліда, якая, прабачце за натуралізм, нават па-маленькаму без дапамогі не сходзіць...

Хтосьці скажа: ну, ёсць такія дзівакі. Рабіць няма чаго — хай сабе і носіцца. Але гэта не той выпадак. У Іны — так завуць нашу гераіню — цяжкахворая адзінацацігадовая дачушка, сын-студэнт, немаладая мама. Усе яны патрабуюць часу, клопату, увагі. Пры гэтым жанчына працуе, а яшчэ дапамагае дзецям, хворым на анкалогію, і жывёлам, якія трапілі ў бяду. У самой у невялікай кватэры, акрамя ўжо згаданага Малыша, жыве яшчэ адзін сабака і як мінімум пяцёра катоў. Усе яны — падабраныя і выратаваныя. Аднойчы яна ў нашай віртуальнай размове расказала гісторыю іх з'яўлення. Усе падабраныя ці падкінутыя «жаласлівымі» людзьмі. Усіх забірала дамоў, бо «прападуць жа». І Малыша яна забрала да сябе, кіруючыся прынцыпам, які, напэўна, зрабіла для сябе адным з вызначальных ужо даўно: «Мы не можам дабавіць дзён у іх жыццё, але мы можам дабавіць жыцця ў іх дні»... Ва ўсіх выпадках падтрымлівалі дзеці, — і старэйшыя, і малодшая, якая хварэе: «Нічога, мама, справімся!»

І яны — спраўляюцца. Нават цяпер, калі малодшая дачушка трапіла ў бальніцу, калі сама Іна даволі цяжка хварэла на ковід, яна нічога не прасіла ў людзей, якія ў групе засталіся, а значыць, гатовыя дапамагаць. Хіба што пазычыць раскладушку, каб старэйшая дачка магла пераначаваць каля малодшай у бальніцы. Хіба што каб хтосьці прыйшоў вынесці Малыша на вуліцу, пакуль у яе самой тэмпература.

Малыш цяпер не тое што ідзе на папраўку, але пачувае сябе добра. Любіць усякія прысмакі, брэша на катоў, хоць з адным, шэрым Дзімкам, нават пасябраваў. Іна сама ўжо выздаравела. Змясціла ўчора відэа: усе гадаванцы вакол яе ў пакоі, і ў кожных вачах — столькі любові, веры і ўдзячнасці. Дачакаліся яны і малодшую гаспадыню: дзяўчынцы палепшала, і ўчора яе выпісалі з бальніцы... Усё ў гэтай сям'і абавязкова будзе добра. Дабро, якое не на словах, а на справах, Там, наверсе, незаўважаным не застаецца.

ДАРЭЧЫ, рэквізіты, на якія збіраем «пенсіён» для Малыша, ведаю і магу імі падзяліцца. Гэта я так, на ўсякі выпадак. Раптам хто таксама захоча — не словамі, а справай...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

**Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 29 декабря 2021 г. в 10.00 повторного открытого аукциона с понижением начальной цены на 50 % после третьих несостоявшихся торгов по продаже одним лотом объектов недвижимости – здания и помещения многофункциональных с составными частями и принадлежностями, передаточного устройства канализационная сеть, принадлежащих открытому акционерному обществу «Гомельстекло» на праве собственности**

**Состав лота № 1:**

**Здание многофункциональное, инв. № 350/С-81260. Местонахождение:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Островского, 101/1. **Назначение:** здание многофункциональное. Двухэтажное кирпичное строение 1956 года постройки. Общая площадь 503,4 кв. м. Составные части и принадлежности: три кирпичные пристройки, терраса, навес.

Части здания общей площадью **388,17 кв. м сданы в аренду** с наибольшим сроком по 31.05.2024 г.

**Помещение многофункциональное, инв. № 350/D-236573. Местонахождение:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Островского, 101-2. **Назначение:** помещение многофункциональное. Изолированное нежилое помещение в капитальном строении 1949 года постройки. Расположение: 1–3 этаж, машинное отделение. Общая площадь 3433,5 кв. м. Составные части и принадлежности: 11 одноэтажных кирпичных пристроек, 1 трехэтажная кирпичная пристройка, 3 пристройки из блоков ПГС, 1 пристройка смешанного типа (кирпич, металл), машинное отделение, навес над крыльцом, навес, проезжая часть.

Части помещения общей площадью **2 080,84 кв. м сданы в аренду** с наибольшим сроком по 21.07.2024 г.

Канализационная сеть, **инв. № 350/С-165888. Местонахождение:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Островского, 101. **Назначение:** сооружение специализированное водохозяйственного назначения. Протяженность – 85,4 м. Способ прокладки – подземный.

Составные части и принадлежности: трубопровод безнапорный от КК-1 до КК-3, от КК-3 до КК-4, от КК-4 до КК-7, от КК-6 до КК-7, от КК-5 до КК-6; колодец КК-1, КК-2, КК-3, КК-5, КК-6, КК-4.

**Прочее имущество, входящее в состав лота:** ворота с электротельфером (инв. № 28676), площадка асфальтированная (инв. № 28677), теплотрасса (инв. № 50032), канализационные сети (инв. № 50081), силовой трансформатор (инв. № 147924), щит пятиконтактный (инв. № 147923), автоматический регулятор (инв. № 450358), теплосчетчик ТЭРМ-02 (инв. № 450274), охранно-пожарная сигнализация (инв. № 450729)

**Начальная цена лота: 677 280,00 рублей** (в т. ч. НДС по ставке 20 %).
**Задаток: 20 318,40 рублей** (в т. ч. НДС по ставке 20 %)

**Земельный участок** для обслуживания зданий на праве постоянного пользования (общее долевое право, доля **41/50**) площадью **0,5306 га** с кадастровым номером **340100000005000758.** Земельный участок, на котором расположена канализационная сеть с инв. № 350/С-165888, с кадастровым номером **340100000005006748** (присвоен предварительно). Переход права на земельные участки осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23, каб. 1.1. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 28 декабря 2021 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **29 декабря 2021 г.** Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объекты по начальной цене, увеличенной на 5 %.

**При подаче заявления участник должен иметь**: 1) копию платежного документа с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть и при себе иметь все необходимые реквизиты.

